Паставіць пад дах саўгаснае і калгаснае стада да першага лістапада

Саўгасы адказваюць за пасьпяховае сканчэньне будаўніцтва сьвінарнікаў і скотных двароў нароўні з будаўнічымі вучасткамі

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 269 (4175)
СУБОТА 3 кастрычніка
1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Створым магутную мясную і кансэрвовую прамысловасьць

У сьвятле задач сацыялістычнага будаўніцтва, якія зараз стаяць перад нашай краінай, адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці мае вялізарнае значэньне.

У строй пігантаў індустрыі ўваходзяць усё новыя і новыя прадпрыемствы. Лічбы 518 і 1040 з вялікім посьпехам перавараюцца ў жыцьцё. Кожны год у прамысловасьць упіваюцца новыя мільёны рабочых і работніц. Будуюцца сацыялістычныя, пашыраюцца старыя гарады. Разам з гэтым адбываецца карэнная помка старых устояў і бытавых звычак рабочай сям'і. «У шырокіх маштабах расьце грамадзкае харчаваньне і яшчэ шпарчэй — патрэбнасьць у ім».

У гэтых умовах асаблівае значэньне набывае справа карэннай рэканструкцыі існуючых і будаўніцтва новых прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці.

У разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці за апошнія гады дасягнут рад посьпехаў. У той час, як кансэрвовая прамысловасьць у дарэвалюцыйны перыяд насіла характар адсталых, саматужнага тыпу, прадпрыемстваў і давала ў год толькі 30 млн. банак — у СССР за апошнія гады пабудован 41 кансэрвовы завод, якія разам з рэканструяванымі заводамі выпрацоўваюць у год 1.200 млн. 400-грамавых банак. Пабудавана 10 мясакамбінатаў сярэдняга тыпу і 17 бэконных фабрык.

УСЁ ГЭТА ДАЛО МАГЧЫМАСЬЦЬ УЖО Ў 1930 ГОДЗЕ ВЫПУСЬЦІЦЬ КАНСЭРВОВАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў 3 РАЗЫ БОЛЬШ, ЧЫМ ДАВАЛА Ў ГОД ДАВАЕННАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЦАРСКАЙ РАСІІ.

«Посьпехі гэтыя, аднак, зусім невыстарчальны з пункту гледжаньня тых задач, якія паўстаюць у сувязі за зьменнай абстаноўкай». Як рэканструяваныя, так і новапабудаваныя прадпрыемствы мяса-кансэрвовай прамысловасьці далёка не задавальняюць узросшых запатрабаваньняў з прычыны іх нізкай прапускной здольнасьці і слабага тэхнічнага аснашчэньня. Ня менш сур'ёзнай прычынай затрудненьняў у рабочым забесьпячэньні зьяўляецца таксама адставаньне сырцовай базы.

Бурны рост індустрыялізацыі краіны, асваеньне нашай прамысловасьцю навейшых дасягненьняў тэхнікі, сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі СТВАРЫЛІ МАГУТНУЮ БАЗУ ДЛЯ РАЗЬВІЦЬЦЯ НА НОВАЙ ТЭХНІЧНАЙ АСНОВЕ БУЙНОЙ МЯСА-КАНСЭРВОВАЙ ІНДУСТРЫІ.

Сьледам за вырашэньнем збожжавай праблемы, у краіне разгорнута вялікая работа па арганізацыі буйных жывёлагадоўчых саўгасаў, калгасных жывёлагадоўчых фэрм, арганізацыі сацыялістычных агародных і плодовых гаспадарак, па рэканструкцыі рыбнай справы.

УСЁ ГЭТА АДКРЫВАЕ ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЬЦІ Ў РАЗЬВІЦЬЦІ МЯСНОЙ І КАНСЭРВОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ САВЕЦКАГА САЮЗУ.

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у сваёй адозьве вызначаюць канкрэтныя мерапрыемствы, ажыцьцяўленьне якіх дасьць магчымасьць стварыць магутную харчовую індустрыю.

На працягу 1931-33 год павінна быць пабудавана 57 буйных, сярэдніх і дробных мясапрамысловых камбінатаў з пра пускной здольнасьцю да ПАЎТАРА МІЛЬЁНАЎ МЯСАПРАДУКТАЎ У АДНУ ЗЬМЕНУ. Разам з тым прапанавана харчовай прамысловасьці пабудаваць 59 беўрагавых і плывучых кансэрвовых заводаў з прадукцыйнай магутнасьцю ў дзьве зьмены. 327 млн. банак.

Новыя мясакамбінаты і кансэрвовыя заводы, згодна пастановы ЦК і СНК, будуць пабудованы на працягу двух год і ўвойдуць у строй у 1932-33 годзе. Гэта значыць, што снабжэньне рабочых на працягу 1931-32 году будзе ЦАЛКАМ БАЗАВАЦЦА НА ІСНУЮЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ харчовай прамысловасьці.

Задача паляпшэньня снабжэньня рабочых, а таксама паказаная вышэй акалічнасьць ВА УВЕСЬ УПОР ставяць пытаньне аб карэннай рэканструкцыі існуючых прадпрыемстваў.

Гэта работа павінна ісьці па лініі дабудовы новых цэхаў, рэканструкцыі старых, па лініі правядзеньня цэлага раду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, стварэньня ўстойлівай сырцовай базы, барацьбы з антысанітарыяй, ліквідацыі цякучасьці рабочай сілы і ўраўнілаўкі ў заработнай плаце.

Для таго, каб З ПОСЬПЕХАМ рушыць разьвіцьцё харчовай прамысловасьці, каб забясьпечыць БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ работу новых гігантаў, трэба стварыць УСТОЙЛІВУЮ СЫРЦОВУЮ БАЗУ.

ЦК УсеКП(б) і СНК зацьвердзілі заказ сельскай гаспадарцы «на разгортваньне саўгасаў мясной жывёлагадоўлі ў раёнах «тяготення» мясакамбінатаў і на здачу імі скаціны».

Гэта накладае на ўсе партыйныя арганізацыі, савецкія ўстановы і сыстэму калгассаюзаў абавязак — УЖО ЗАРАЗ ПАЧАЦЬ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎСІХ НЕАБХОДНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ЗАКАЗУ ЦК І СНК.

У гэтых адносінах вялізарныя задачы ўкладаюцца на БССР, як адзін з раёнаў сырцовай базы.

Акрамя існуючых у Беларусі мясакамбінатаў, якія павінны быць значна рэканструяваны, нам патрэбна будзе забясьпечыць сырцом вялікай прапускной здольнасьці магілёўскі мясакамбінат, будаўніцтва якога прадугледжана адозвай ЦК і СНК Саюзу ССР, побач з гэтым запраектавана будаўніцтва хладзільнікаў, скотабаз і іншых прадпрыемстваў падсобнага характару.

Гэта прад'яўляе вялікія запатрабаваньні як да органаў снабжэньня, так і да гаспадарчых арганізацый і сыстэмы калгассаюзаў.

БССР мае вялікія сырцовыя магчымасьці ў справе кансэраваньня гародных, плодавых, грыбных, гарохавых, спаржавых і іншых каштоўных прадуктаў. Пераапрацоўка гэтага віду сырцу павінна заняць важнейшае месца ў кансэрвовай прамысловасьці нашай рэспублікі.

У сувязі з гэтым трэба падкрэсьліць, што работа такіх арганізацый, як БЕЛМЯСА, БЕЛРЫБА, у сучасны момант дзёўка НЕ АДПАВЯДАЕ тым запатрабаваньням, якія да іх прад'яўляюцца.

Паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочай класы знаходзіцца ў простай сувязі з выкананьнем дырэктыў партыі аб разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці. Рэалізацыя усяго гэтага пляну павінна разглядацца, ЯК НЕАДЛУЧНАЯ І ВАЖНЕЙШАЯ ЧАСТКА АГУЛЬНАГА ФРОНТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ.

Задачу карэннага паляпшэньня снабжэньня рабочых НЕЛЬГА вырашыць на базе дробных, распыленых, саматужнага тыпу, харчовых прадпрыемстваў. Гэту задачу МОЖНА ВЫРАШЫЦЬ ТОЛЬКІ НА БАЗЕ БУЙНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, якая-б апіралася на навейшыя дасягненьні сусьветнай тэхнікі.

«Недаацэнка задачы стварэньня новай буйной харчовай індустрыі зьяўляецца такім-жа праяўленьнем апартунізму, якім была недаацэнка ролі буйной с.-г. вытворчасьці на базе саўгасаў і калгасаў у справе вырашэньня збожжавай праблемы.

Рабочая класа нашай краіны мае ўсе ўмовы, каб і ў справе будаўніцтва харчовай прамысловасьці ня толькі дагнаць, але і ў найкарацейшы тэрмін апярэдзіць тэхнічны ўзровень перадавых капіталістычных краін» (з адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР).

НА РЭАЛІЗАЦЫІ АДОЗВЫ ЦК і СНК ПАТРЭБНА ЗАРАЗ ЗГУРТАВАЦЬ УВАГУ УСЁЙ КП(б)Б, УСЁЙ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ, УСІХ САВЕЦКІХ КААПЭРАЦЫЙНЫХ І ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ САПРАЎДЫ БАЙВУЮ РАБОТУ ПА СТВАРЭНЬНІ БУЙНОЙ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Піламатар'ялы выкарыстоўваюцца не па прызначэньні

У саўгасе «Зара захаду» (Заслаўскі раён) у гэтым годзе павінны быць пабудаваны 22 сьвінарнікі, распачата будаўніцтва толькі 11.

Галоўным тормазам будаўніцтва распачатых сьвінарнікаў зьяўляецца недахват піламатар'ялу, якога вывезена ўсяго на 45 проц. Гэта ў той час, калі была поўная магчымасьць вывезьці лесаматар'ялы. Саўгас мае 5 трактараў і 112 рабочых коняй. Трактары-ж выкарыстоўваюцца толькі на 35 проц.

Будаўніцтва зрываецца з-за адсутнасьці піламатар'ялаў, асабліва дошак, а тыя, якія ёсьць скарыстоўваюцца на другараднае будаўніцтва. Нават цяпер, калі быў прысланы вагон дошак, дырэктар саўгасу тав. Гарбуз загадаў узяць 120 дошак на пабудову дому.

Партком слаба кіруе будаўніцтвам. Замест канкрэтных дырэктыў займаецца толькі агульнымі рэзалюцыямі. Так, абгаварыўшы пытаньне аб будаўніцтве, ён пастанаўляе «зрабіць рашучы пералом па вывазцы лесаматар'ялаў, выдаваць падводы кожны дзень па сіле магчымасьці. Даць сьпіс саўгасу каму даручана вывазка лесаматар'ялу».

За апошнія дні на пабудовах вызначыўся некаторы эрух. Будаўнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі, замацаваліся на рабоце да канца будаўніцтва і скончыць пабудову 7 сьвінарнікаў не пазьней 15 кастрычніка.

Брыгада «Зьвязды»: М. САКАЛОЎСКІ, МАСЬЛЯНІКОЎСКІ.

Жывёла пад адкрытым небам

У жывёлагадоўчым саўгасе «ЛІПАВА» (Мазыр) будаўніцтва ідзе марудным тэмпам. З адпушчаных крэдытаў на 96.000 руб. на будаўніцтва скарыстаны толькі 46.000. Памяшканьняў для рабочых няма, не хапае хлявоў для разьмяшчэньня жывёлы, якая стаіць пад адкрытым небам.

Загадчык саўгасу замест таго, каб мабілізаваць рабочых саўгасу і ўсе ўнутраныя рэсурсы для хутчэйшай пабудовы жылых памяшканьняў і хлявоў, чакае, пакуль прышлюць цьвікі.

Саўгас да гэтага часу не заключыў ні аднаго дагавору з калгасам аб арганізацыі наборы рабочай сілы для будаўніцтва.

Адсутнічае масава-выхаваўчая работа сярод будаўнікоў.

Треба ўзмацніць тэмпы будаўніцтва ў саўгасе «Ліпава». Нешкевіч

Недапушчальныя факты

КРЫЧАЎ. Ганебнае адставаньне ў разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі тлумачыцца безадказнымі адносінамі праўленьняў калгасаў і самім калгасьнікаў да гэтай важнейшай задачы. Райкалгассаюз нядбайна адносіцца да выдачы крэдытаў калгасам. Ёсьць выпадкі, калі для ўкамплектаваньня 100 сьвіньматак, даваўся крэдыт у 30-40 руб., а некаторым калгасам на меншую колькасьць пагалоўя давалася па 900-1000 руб. Рад калгасаў крэдытны скарыстоўваюць не па прызначэньні.

Калгасы «Чырвоны пахар», «1-га мая», імя Маркса і інш. растрэлілі адпушчаныя ім крэдыты на іншыя патрэбы, ня гледзячы на неадпаведныя папярэджаньні з боку райкалгасаюзу.

Раённы плян укамплектаваньня МТФ на 10 верасьня выкананы на 80 проц. Але гэта ня значыць, што становішча з укамплектаваньнем па раёне не пагражаючае. Чатыры жывёлагадоўчых калгасы яшчэ зусім ня прыступілі да ўкамплектаваньня кароўнікаў. Калгасы «Зара», «Заветы Леніна», дасягнуўшы невялікага процанту ўкамплектаваньня МТФ, зараз зусім спынілі работу.

Ня лепш з укамплектаваньнем СТФ. Плян укамплектаваньня сьвінагадоўчых фэрм па раёне выкананы на 51 проц. Калгасы «Труд» і імя Парыскай камуны плян укамплектаваньня выканалі на 4-5 проц.

Зусім іншае становішча ў тых сельсаветах, дзе парт'ячэйкі па-бальшавіцку ўзяліся за выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Так, калгасы «Чырвоны партызан» і «Чырвоны барацьбіт» у асноўным скончылі будаўніцтва і ўкамплектаваньне. Прыкладны гэтых калгасаў павінны быць перанесены на астатнія калгасы раёну.

Будаўніцтва і ўкамплектаваньне МТФ і СТФ патрэбна перавесьці на ўдарныя тэмпы. Парт'ячэйкі, сельсаветы і праўленьні калгасаў павінны зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў вакол пастановы ЦК КП(б)Б і СНК аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Алан.

Дырэктар ківае на Сельбуд...

У саўгасах Лагойскага раёну шырока разгорнутаму будаўніцтву пагражае арыў.

У саўгасе Луцаўшчына распачата будаўніцтвам каля 20 аб'ектаў, але ні адзін яшчэ ня скончан. Дырэктар гаворыць, што за будаўніцтва адказвае Сельбуд, а Сельбуд ківае на дырэктара. Адміністрацыя саўгасу ня выканала дагавору аб вывазцы лесаматар'ялаў.

З-за адсутнасьці круглага лесаматар'ялу зрываецца будаўніцтва ў саўгасе «Красіна».

У саўгасе «Буцянаўцы» цыркулярка і пасы мокнуць пад дажджом. У гэтымжа саўгасе ёсьць 4 трактары і ні адзін з іх не працуе. Ні куды ня варта бытавое абслугоўваньне рабочых будаўнікоў. У сталоўцы цесната, за адным сталом абедаюць 70 рабочых. Тут-жа сьпіць работніцы саўгасу.

Між тым ля саўгасу ёсьць больш 10 кулацкіх хат, якія пры нязначным рамонце могуць быць скарыстаны пад кватэры для рабочых. Склады Белсельбуду і кантора прараба завалены прамтаварамі, а рабочыя на працягу лета нічога не атрымлівалі.

Будаўніцтва павінна быць закончана ва што-б там ні стала, трэба біць па апартуністах, якія ня хочуць выконваць баявых загадаў партыі. Раённыя арганізацыі, якія яшчэ не павярнуліся тварам да будаўніцтва ў саўгасах, павінны ўдарнымі тэмпамі нагнаць прапушчанае. Вэржліп Антоненка.

Лесаматар'ял гніе

ДУБРОЎНА. Будаўніцтва сьвінарнікаў і абор па раёне праходзіць надзвычай марудна.

У камуне «Чырвоная палянка» сьцены сьвінарніка выведзены яшчэ ў мінулым годзе, а будынак ня скончан і зарас. У калгасе імя Карла Маркса плян будаўніцтва сьвінарніка выкананы толькі на 37 проц. У калгасе «Зара» лесаматар'ял гніе, а сьвінарнік ня будуецца.

Недапушчальная марудна́сьць будаўніцтва сьвінарнікаў і абор тлумачыцца адсутнасьцю арганізаванага набору рабочай сілы, стаўкай на самацёк. Чарняўскі.

175.000 тон бульбы—Ленінграду

ПРАЗ 7 ДЗЕН КАПАНЬНЕ БУЛЬБЫ ПАВІННА БЫЦЬ СКОНЧАНА!

Уборка ў калгасе «Новы шлях»

Аб ходзе капаньня і адгрузкі бульбы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Адзначаючы недапушчальную зацяжку капаньня бульбы і зусім слабую адгрузку яе ў г. Ленінград, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Белкалгасцэнтр і Белкаапсаюз ужыць рашучыя захады для таго, каб не пазьней 10-га кастрычніка г. г. скончыць поўнасьцю капаньне бульбы.

2. Даручыць Белкалгасцэнтру разгарнуць шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў аб узаемнай дапамозе калгасамі ў капаньні бульбы, а таксама прасіць ЦСПСБ распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для аказаньня дапамогі прафсаюзнымі арганізацыямі ў капаньні бульбы ў саўгасах і калгасах.

3. Абавязаць Наркамснаб і Белкаапсаюз выпучыць спэцыяльны фонд прамысловых тавараў для стымуляваньня капаньня бульбы ў больш вялікіх саўгасах і калгасах.

4. Апошні тэрмін скончэньня адгрузкі бульбы ў г. Ленінград устанавіць 1 лістапада.

Абавязаць Наркамснаб устанавіць ляндарны плян адгрузкі бульбы за жы БССР па кожным раёне.

5. Абавязаць дырэкцыю МББ чыгуні пад адказнасьць тав. Палода ўжыць захады да поўнага забясьпячэньня рухавым складам перавозку бульбы ў г. Ленінград, а загатоўчым арганізацыям, якія адгружаюць бульбу, на працягу аднаго дня падаць чыгунцы адпаведныя зьмены ў пляне адгрузкі бульбы з улікам скарачэньня тэрмінаў адгрузкі.

Нам. старшыні СНК БССР А. КАЛНІН

Кіраўнік справаў СНК і Эканомвету БССР КАНДЫБОВІЧ

2-га кастрычніка 1931 г.
г. Менск.

Выканаць плян поўнасьцю і своячасова

ГАРАДОК.

У раёне разгорнута ўдарная работа па адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам. РК КП(б)Б і РВК мабілізаваны і накіраваны ў сельсаветы і калгасы 60 раённых работнікаў у дапамогу нізавым арганізацыям.

25 верасьня адбылася раённая нарада сакратароў партыйных ячэек і старшынь сельсаветаў. НА НАРАДЗЕ ПРЫСУТНІЧАЎ СТАРШЫНЯ ЦВК БССР ТАВ. ЧАРВЯКОЎ. У гонар прыезду тав. Чарвякова па ўсім раёне былі арганізаваны масавыя чырвоныя абозы са збожжам, ільном і бульбай.

Усе раённыя арганізацыі мабілізаваны на поўнае выкананьне плянаў уборкі, загатовак і адгрузкі бульбы. Стаўка ўзята на скончэньне гэтай работы не пазьней 10 кастрычніка. Усе сельсаветы прымацаваны да асобных станцый і кожнаму вызначаны поўныя дні адгрузкі. Зараз ужо адгружана 1.000 тон бульбы, што складае 15 проц. агульнага раённага пляну.

Аднак, побач з ударнай работай большасьці сельсаветаў, ёсьць асобныя сельсаветы, якія апартуністычна адносяцца да гэтай важнейшай справы. Так, СЯЛІШЧАНСКІ сельсавет сарваў свае дні адгрузкі.

Райкаапсаюз на чале з тав. ГУРЗЕЧАМ таксама бязьдзейнічае. Да гэтага часу не падрыхтаваны склады, прыёмныя пункты не забясьпечаны належнай колькасьцю работнікаў. У выніку ствараюцца «пробкі» пры паступленьні абозаў з бульбай.

26 верасьня прыёмачны пункт станцыі быў зусім закрыты. Прыбышыя абозы з бульбай прасталі больш дня і многія здатчыкі паехалі назад, не здаўшы бульбы. РК КП(б)Б рэагаваў на гэтыя агіднасьці і прыцягнуў вінаватых да судовай адказнасьці.

Упартай работай за высокія тэмпы ўборкі, загатовак і адгрузкі бульбы Гарадоцкі раён даб'ецца поўнага і своячасовага выкананьня сваіх абавязкаў перад пралетарскімі цэнтрамі.

ЭМБЭ.

9.000 РАБОЧЫХ—ДАНБАСУ

ТОЛЬКІ 4 РАЕНЫ— ХОЙНІЦКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, БРАГІНСКІ І ТАЛОЧЫНСКІ ВЫКАНАЛІ

заданьне па наборы будаўнікоў ДА 5-га КАСТРЫЧНІКА

засталося два дні УСЕ СІЛЫ на своячасовае скончэньне НАБОРУ

Тав. КУПРЫЯНАЎ — машыніст, ударнік камсамольскай павы шахты імя Максіма Горкага.

БРАГІН. НА 2-ГА КАСТРЫЧНІКА БРАГІНСКІ РАЁН АДПРАВІЎ У ДАНБАС 223 РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ. ТАКІМ ЧЫНАМ, ЗАДАНЬНЕ НАРКАМПРАЦЫ ПЕРАВЫКАНАНА. СТАРШЫНЯ РВК ТАВ. АНІКЕЙЧЫК ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО ВЯРБОЎКА ПА РАЁНЕ ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

ТАЛАЧЫН. ТАВ. ЧАПЛІНСКІ ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО ЗАДАНЬНЕ ПА ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ ДАНБАСУ ВЫКАНАНА ПА РАЁНЕ НА 110 ПРОЦ.

ПРАПОЙСК. ПРАПОЙСКІ РАЁН НА 2-ГА КАСТРЫЧНІКА АДПРАВІЎ 117 РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ ЗАМЕСТ 260 ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ. МАРУДНАЯ ВЯРБОЎКА ТЛУМАЧЫЦЦА ТЫМ, ШТО РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ НАДАЛІ НАЛЕЖНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ ГЭТАЙ СПРАВЕ. З КАЛГАСАМІ НЕ ПРАВЕДЗЕНА АДПАВЕДНАЙ РАБОТЫ, У ВЫНІКУ ЧАГО ПРАЎЛЕНЬНІ НЕ АДПУСКАЮЦЬ КАЛГАСЬНІКАЎ У ДАНБАС. ТАК, СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ «ПЕРАМОГА» ТАВ. КРАСНАБАЕЎ ЗАЯВІЎ: « Я НЕ АДПУШЧУ НІ АДНАГО РАБОЧАГА».

РАЙКАЛГАССАЮЗ НЯ МАЕ ЎЛІКУ РАВСІЛЫ ПА КАЛГАСАХ. ВЯРБОЎКА ІДЗЕ ЗА КОШТ АДНААСОБНІКАЎ.

РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ПА-САПРАЎДНАМУ ЎЗЯЦЦА ЗА ПРАЦУ ВЯРБОЎКІ РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ З ТЫМ, КАБ ЗАДАНЬНЕ ПОЎНАСЬЦЮ БЫЛО ВЫКАНАНА.

Упаўнаважаны ЦК КСМБ КАНДРАЦЬЦЕЎ.

***

ХОЙНІКІ. ЗАДАНЬНЕ ПА ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧАЙ СІЛЫ ДЛЯ ДАНБАСУ ХОЙНІЦКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПОЎНАСЬЦЮ. НА 2-ГА КАСТРЫЧНІКА АДПРАЎЛЕНЫ 303 РАБОЧЫЯ-БУДАЎНІКІ, ШТО СКЛАДАЕ 101 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

ТРЭБА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО ПА РАЁНЕ ЁСЬЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ ГЭТУ ЛІЧБУ ПЕРАВЫКАНАЦЬ.

АПРАЧА АДПРАЎЛЕНЫХ 303 РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ ПА РАЁНЕ ЯШЧЭ ЗАВЕРБАВАНА БОЛЬШ 100 АСОБ.

Упаўнаважаны НКПБ ГОЛЬДБЭРГ.

***

БЫХАЎ. РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ БЫХАВА ПАЛЕЦ АБ ПАЛЕЦ НЯ ЎДАРЫЛІ ДЛЯ ТАГО, КАБ ВЫКАНАЦЬ ЗАДАНЬНЕ НКПБ ПА ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧАЙ СІЛЫ ДАНБАСУ. КІРАЎНІКІ РАЁНУ АПАРТУНІСТЫЧНА АДНЕСЬЛІСЯ ДА ГЭТАГА ВАЖНЕЙШАГА ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНАГА ЗАДАНЬНЯ ПАРТЫІ І ЎРАДУ.

НА 2-ГА КАСТРЫЧНІКА БЫХАЎСКІ РАЁН НЕ ЗАВЕРБАВАЎ НІ АДНАГО РАБОЧАГА ЗАМЕСТ 250 ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ.

ДА КАНЦА ВЯРБОЎКІ ЗАСТАЛІСЯ ЛІЧАНЫЯ ДНІ. ТРЭБА, КАБ ГЭТЫЯ ДНІ ЗЬЯВІЛІСЯ ДНЯМІ БАЯВОГА ШТУРМУ ПРАРЫВАЎ Ў ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ ДЛЯ ДАНБАСУ.

***

РАЁНЫ: ЛОВЎСКІ, ПЯТРЫКОЎСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ, ЧЭРЫКАЎСКІ, КЛІЧАЎСКІ, ЛЕЗЬЯНЯНСКІ, БЯЛЫНІЦКІ, ВЯРЭЗІНСКІ, ГОРАЦКІ, ЖЛОБІНСКІ, ЕЛЬСКІ, КАРМЯНСКІ, КАСЬЦЮКОВІЦКІ, КЛІМАВІЦКІ, КРУПСКІ, ЧАВУСКІ, РАГАЧОЎСКІ, РЭЧЫЦКІ, УВАРАВІЦКІ, ЧАШНІЦКІ, ШКЛОЎСКІ І ГАРАДОЦКІ, ЯКІЯ ПАВОДЛЕ ПАСТАНОВЫ НАРКАМПРАЦЫ БЕЛАРУСІ ПАВІННЫ ДА 5-ГА КАСТРЫЧНІКА ПАСЛАЦЬ У ДАНБАС 855 БУДАЎНІКОЎ, ДА 2-ГА КАСТРЫЧНІКА НІЯКІХ ВЕСТАК АБ ГЭТАЙ РАБОЦЕ НЕ ДАЛІ.

Зводка пасылкі будаўнікоў у Данбас на 2-га кастрычніка

НАЗВА РАЁНАЎ.	Заданьне	Паслана
Хойніцкі	300	303
Чырвонапольскі	250	300
Брагінскі	200	223
Глускі	320	203
Чатэрскі	300	190
Талачынскі	200	171
Сураскі	350	153
Плешчаніцкі	160	147
Капыльскі	250	123
Прапойскі	250	117
Веткаўскі	220	107
Буда-Кашалёўскі	240	100
Стара-Дароскі	220	86
Лагойскі	150	75
Бягомльскі	150	65
Пухавіцкі	240	60
Койданаўскі	150	52
Церахаўскі	240	49
Старобінскі	250	37
Чырвона-Слабода.	150	33
Быхаўскі	250	0

Усяго паслана ў Данбас 2.594 будаўнікі, што складае каля 65 проц.

Гомельскаму гаркому КП(б)Б, гарсавету, Гарпрафсавету, Гарфа, рэдакцыі „Палескай праўды" і заводу імя Ланцуцкага

Вітаю з перавыкананьнем пляну мабілізацыі сродкаў трэцяга кварталу. Перамога дасягнута дзякуючы энтузіязму рабочых мас Гомельшчыны, асабліва рабочых заводу імя Ланцуцкага і ўсёй грамадзкасьці, пры выразнай рабоце фінансавага апарату, пад кіраўніцтвам гаркому КП(б)Б і гарсавету.

Наркамфін спадзяецца, што Гомельшчына і надалей будзе прыкладам лепшага змагара за бальшавіцкія тэмпы выканаьня фінпляну.

Нам. наркамфіну БССР АБРАМСОН.

Сушыльшчыку, мяльшчыку і трапальшчыку

устанавіць павышаныя расцэнкі і прадаць ня менш паловы ўсіх прамтавараў

Пастанова НКЗ і Белкалгасцэнтру БССР

Адзначыць вусім нездавальняючую падрыхтоўку і разгортваньне першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель па БССР, што ставіць пад пагрозу своячасовую здачу прадукцыі дзяржаве.

Выходзячы з гэтага і ў разьвіцьцё пастановы НКЗ, Калгасцэнтру ССР і Галоўпенкому аб правядзеньні першапачатковай апрацоўкі, сушкі, мяцьця і трапаньня прасьцейшымі спосабамі, НКЗ БССР і Белкалгасцэнтр ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Абавязаць загадчыкаў райза і старшынь калгассаюзаў мабілізаваць усе наяўныя сушыльныя памяшканьні, бўні пазьні і інш. і ўвесь інвэнтар на апрацоўку ільну і канапель, забясьпечыўшы максымальнае іх скарыстаньне.

Пацьвердзіць устаноўленыя пастановай калегіі НКЗ БССР ад 25-VI г. г. нагрузкі на машыны на менш:

2-хвальныя мялкі — 0,6 тон трасты.
3-хвальныя мялкі — 1,0 тон трасты.
6-цівальныя мялкі — 4 тон трасты.
12-цівальныя мялкі — 5 тон трасты.

2. Устанавіць норму выпрацоўкі пры ручным трапаньні ня менш 13-16 кілё гатовага валакна на кожнага трапальшчыка ў рабочы дзень.

3. Улічваючы адказнасьць работы па сушцы, цяжкасьць работы па мяцьці, а па трапаньні, апрача таго, неабходнасьць навыку ў рабоце, павысіць расцэнкі ў працадніёх за сушку, мяцьцё і трапаньне ільну і канапель прыкладна на 20 проц. супроць расцэнак работ па церабленьні.

4. Калгасьнікам і калгасьніцам, якія сушылі мялі і трапалі лён, павінна быць прадана ня менш паловы ўсіх прамтавараў, якія калгас атрымлівае пры здачы валакна, прычым разьмеркаваньне прамтавараў паміж гэтымі калгасьнікамі праводзіцца ў адпаведнасьці з колькасьцю выпрацаваных працадзён.

5. Пасьля продажу валакна ў калгасах павінны быць створаны спэцыяльныя фонды ў разьмерах 5-10 проц. ад сумы атрыманых грошай за прададзенае валакно для прэміраваньня брыгад, брыгадзіраў і ўдарнікаў за куткасьць перашпачатковай апрацоўкі, за якасьць працы, за эканомію ў стратах і г. д.

6. Адказнасьць за своячасовае правядзеньне апрацоўкі і здачы таварнай прадукцыі ільнавалакна і пянькі ў калгасах, якія абслугоўваюць МТС, усклядаецца на дырэктароў МТС у калгасах, не ахопленых МТС — на старшынь калгассаюзаў, а ў аднасобных сэктары — на старшынь райкаапсаюзаў ільнаводчай сыстэмы.

7. Абавязаць загадчыкаў райза выпучыць упаўнаважаных па сельсаветах адказных за своячасовую апрацоўку і здачу дзяржаве таварнай прадукцыі ільна-валакна і пянькі.

8. Праз 2 дэкады на калегіі НКЗ заслухаць даклады загадчыкаў Дрысенскага, Гарадоцкага, Бешанковіцкага, Касьцюковіцкага і Дубровенскага райза аб выкананьні гэтай пастановы.

9. Даручыць сэктару праверкі выкананьня сумесна з сэктарам тэхнічных культур арганізаваць праверку выкананьня гэтай пастановы па 4-6 раёнах.

Нам. народнага камісара земляробства БССР ПАНІМАТКА.
Нам. старшыні праўленьня Белкалгасцэнтру СТРЭЛЕ.

ПЕРАМОЖЦЫ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ

Ворша перавыканала фінплян трэцяга кварталу

ВОРША. (БЕЛТА).

Аршаншчына ПЕРАВЫКАНАЛА СВОЙ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН па мабілізацыі сродкаў трэцяга кварталу. Замест 1.654 348 руб. паводле пляну мабілізавана сродкаў на 1.755.917 руб.

Плян выканан на 106,1 проц. Плян перавыканан, дзякуючы актыўнай барацьбе працоўных Аршаншчыны за мабілізацыю сродкаў, за пакіданьне пераходнага сьцягу Наркамфіну БССР у Аршанскім раёне.

СЕЛЬПАРТКОМЫ І ЯЧЭЙКІ АДКАЗВАЮЦЬ
за рэалізацыю адозвы ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі

БУДАЎНІЦТВА СКОТНЫХ ДВАРОЎ І СЬВІНАРНІКАЎ, УКАМПЛЕКТАВАНЬНЕ САЎГАСНЫХ І КАЛГАСНЫХ ФЭРМ—СКОНЧЫЦЬ НА ПРАЦЯГУ БЯГУЧАГА МЕСЯЦА

Канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць парткіраўніцтва—ключ да практычнага ажыцьцяўленьня вызначаных пастановай ЦК КП(б)Б мерапрыемстваў

Кастрычнік—рашаючы месяц

Кастрычнік зьяўляецца рашаючым месяцам у справе рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) і пастановы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі. У залежнасьці ад таго, наколькі мясцовыя партарганізацыі і ў першую чаргу сельпарткомы і ячэйкі жывёлагадоўчых раёнаў і саўгасаў разгорнуць работу па ліквідацыі прарываў у будаўніцтве, ва ўкамплектаваньні стада, у пашырэньні кармовай базы — залежаць новыя посьпехі на адказьнейшым вучастку сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б абвясьціў ударны двухмесячнік (верасень і кастрычнік) па ліквідацыі прарываў у выкананьні плянаў разгортваньня жывёлагадоўлі. Цэлы рад раённых партарганізацый з першых-жа дзён абвешчаньня двухмесячніка пераключыўся на яго пра вядзеньне і дабіўся поўнага зруху, асабліва ў сэнсе камплектаваньня малочных фэрм.

Аднак, зусім новыстарчальны зрух унесьлі першыя дні двухмесячніка ў будаўніцтве. У радзе раёнаў БУДАЎНІЦТВА АДБЫВАЕЦЦА НАДЗВЫЧАЙНА МАРУДНЫМІ ТЭМПАМІ. Па саўгасах «БАНОНЬ - БЯЗЬДЗЕДАВІЧЫ» будаўніцтва — пад пагрозай. Апартуністы — кіраўнікі саўгасу — сваю бязьдзейнасьць імінуцца пакрыць шырмай «аб'ектыўных» прычын (недахват расьпіловачных матар'ялаў і рабочай сілы). Аднак, дырэктары гэтых саўгасаў ня ўжылі ніякіх мер для таго, каб скарыстаць усе ўнутраныя рэсурсы, каб поўнасьцю непрузіць лесапілку, яная ёсьць у саўгасе, каб правільна арганізаваць працу і павысьці змагальне з цякучасьцю рабочай сілы. ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ ГЭТЫХ САЎГАСАЎ ПРАЯВІЛІ НЯЎМЕНЬНЕ АПЭРАЦЫЙНА КІРАВАЦЬ БУДАЎНІЦТВАМ. Толькі пасьля таго, калі арганпартгрупа ЦК КП(б)Б рэзка паставіла пытаньне аб будаўніцтве ў саўгасах, ужыт рад практычных мер па ліквідацыі прарываў.

Гэта ўсё прымушае з усёй рэзкасьцю паставіць пытаньне перад раённымі партарганізацыямі аб перабудове работы сельпарткомаў і ячэек жывёлагадоўчых саўгасаў, аб павароце сельпарткомаў і ячэек тварам да вытворчых задач, да вырашэньня ўсёй сумы практычных заданьняў, ад якіх залежыць рэалізацыя адозвы ЦК УсеКП(б) і пастановы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні жывёлагадоўлі.

Пытаньне выкананьня плянаў БУДАЎНІЦТВА поўнасьцю і ў тэрмін — адно з цэнтральных, яно павінна заняць увагу партыйных ячэек. Трэба нанесьці бязьлітасны ўдар па апартуністах, якія ня хочуць выкарыстаць унутраныя рэсурсы і магчымасьці для выкананьня плянаў будаўніцтва, кожная ячэйка трэба заняцца як сьлед канкрэтнымі пытаньнямі рэалізацыі будаўнічых плянаў. Гэта значыць, што кожная ячэйка павінна паставіць пытаньне аб тым, што канкрэтна патрабуецца для таго, каб выканаць пляны будаўніцтва, чым у даных канкрэтных умовах можна замяніць тыя матар'ялы, якіх не хапае. На першы погляд дробныя, а па сутнасьці надзвычай вялікія і важныя пытаньні павінны стаць у парадак дня партыйных ячэек.

Усё гэта ва ўвесь рост ставіць перад ячэйкамі задачу шчыльна падыйсьці да пытаньня камплектаваньня. Асабліва партыйныя ячэйкі павінны аддаць вялікую ўвагу справе адбору племяннога стада. Асабліву вострасьць гэтае пытаньне набывае ў сувязі з тым, што ў радзе месц адбор племяннога стада зводзіцца да простай выбракоўкі, што ў радзе саўгасаў закон гэтага важнейшага мерапрыемства не сканцэнтроўваецца грамадзкая думка рабочых.

Пашырэньне кармовай базы — адзін з асноўных момантаў у разьвіцьці жывёлагадоўлі. Партыйныя ячэйкі павінны дабіцца, каб пляны сіласаваньня былі выкананы. Перамагаючы ўсялякія апартуністычныя разважаньні аб тым, што, моў, няма чаго сіласаваць, што ў нас кармоў хопіць і бяз сілясу, трэба ўзмерна пашыраць кармовую базу. Разам з гэтым трэба рэзка паставіць пытаньне аб правільным выдаткаваньні кармоў у кожным саўгасе і калгасе.

Посьпехаў у практычным вырашэньні гэтых важнейшых пытаньняў партыйныя ячэйкі дабіцца толькі пры гэй умове, калі шчыльна падыйдуць да пытаньняў вытворчасьці, калі арганізуюць працу ў саўгасах па прынцыпе прагрэсыўнай падапышчыны, калі дабіцца ліквідацыі бязьпічні і ўраўнілаўкі, калі актыўнасьць рабочых мас накіруюць на разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Кастрычнік — ударны месяц у барацьбе за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі. БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАРНІКАЎ, АБОР, СКОТНЫХ ДВАРОЎ, КАМПЛЕКТАВАНЬНЕ ТАВАРНЫХ ФЭРМ, АДБОР ПЛЕМЯННОЙ ЖЫВЁЛЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ СКОНЧАНЫ Ў КАСТРЫЧНІКУ МЕСЯЦЫ.

На забесьпячэньне гэтай важнейшай задачы трэба мабілізаваць усе сілы партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

Выкананьне праграмы патрабуе
цьвёрдага бальшавіцкага кіраўніцтва, рашучай перабудовы партыйнай і прафсаюзнай работы

Нядаўна спэцыяльная камісія перахаўскай РКК-РСІ абсьледавала работу трыкутніка саўгасу «Насовічы». Камісія выявіла рад недапушчальных фактаў у рабоце саўгасу. Да гэтага часу ня выкананы дырэктывы партыі аб укамплектаваньні матачнікаў і пляны здачы таварнай прадукцыі. Надзвычайна дрэнна наладжан догляд жывёлы. Мелі месца выпадкі, калі на 2-3 сьвіньні сталі някормленымі. У саўгасе ёсьць рад прарываў па сяўбе, будаўніцтве, сіласаваньні і г. д.

Усё гэта зьяўляецца вынікам таго, што працуюць у саўгасе па-старому. Ва ўсёй рабоце пануе абязьлічка, ніхто ні за што не адказвае. Працоўная дысцыпліна адсутнічае.

Сакратар сельпарткому Дворачкін яўна ігнаруе дырэктывы партыі аб перабудове работы, аб перанясьненьні цэнтру цяжару партыйнай работы ў нізавое зьвяно. Такая-ж бязьдзейнасьць мае месца і з боку дырэкцыі саўгасу і рабочага камітэту.

Камісія РК-РСІ паставіла пытаньне аб зьмене дырэкцыі саўгасу і прыцягненьні да судовай адказнасьці. Бюро парткому і рабочы камітэт распушчаны. Аднак, пастанова камісіі аб адміністрацыі да гэтага часу чамусьці ня выканана.

Да канца бягучага году саўгас «Насовічы» павінен здаць ня менш 1.850 адкормленых сьвіней. Абнаўленьне «трыкутніка» павінна адбыцца неадкладна з тым, каб праграма здачы таварнай прадукцыі была выканана своячасова і поўнасьцю.

А. А. Ю.

Галоўнае ў рабоце партячэек—
забясьпечыць вызначаныя тэрміны будаўніцтва

Будаўніцтва СТФ па саўгасах «Баноль-Бязьдзедавічы» і «Варонічы», Полацкага раёну, праходзіць надзвычай марудным тэмпамі. Заўважваецца значны недахват піламатар'ялаў, у той час, як у абодвух саўгасах ёсьць пілаўстаноўкі. Але яны працуюць толькі ў адну зьмену і таму задаволіць піламатар'ялам будаўніцтва СТФ ня могуць. Дырэкцыя саўгасаў і 16-ты будаўчастак ніяк ня могуць дагаварыцца паміж сабою аб тым, каму, колькі і якіх матар'ялаў трэба дастаўляць на будаўніцтва.

У саўгасах недапушчальна дрэнна пастаўлена арганізацыя работ. Да гэтага часу ня створаны брыгады, а праца даручаецца арцелям, у якіх панує ўраўнілаўка ў зарплаце (кваліфікаваныя цесьляры атрымліваюць на 1 р. 50 кап.—2 рублі ў суткі). Прэміяльна-зьдзельная аплата работы на будаўніцтве ня ўжываецца. Усё гэта прыводзіць да таго, што сярод рабочых няма ніякай зацікаўленасьці да хуткага выкананьня вытворчых планаў.

У ячэйках да гэтага часу не распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Ніякай палітвыхаваўчай работы сярод рабочых саўгасаў ні ячэйкі, ні рабачкомы не праводзяць. Спэцыяльна створаныя «штабы садзейнасьці фарсаваньня будаўніцтва СТФ» ніякай работы не праводзяць.

Зараз па ініцыятыве партгрупы ЦК КП(б)Б у саўгасах прароблена значная работа па рэалізацыі адозвы ЦК і СНК СССР. Нядаўна праведзена нарада «трыкутнікаў» саўгасаў сумесна з прадстаўнікамі будаўчастку. На нарадзе ўстаноўлены каляндарныя пляны будаўніцтва і рад іншых мерапрыемстваў. Значная ўвага зьвернута на палепшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых. Створаны прэміяльныя фонды і г. д. Па ўсіх будаўнічых пунктах праведзены сходы рабочых, на якіх аднадушна прыняты тэрміны выкананьня будаўніцтва, намечаныя на нарадзе «трыкутнікаў».

Усё гэта забясьпечыла некаторы зрух наперад у рабоце па будаўніцтве СТФ. Аднак, усе недахопы яшчэ далёка ня зжыты. Партыйныя ячэйкі павінны на аснове канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва будаўніцтвам забясьпечыць сканчэньне СТФ у самы кароткі тэрмін.

К.

Пад заслонай „аб'ектыўных" прычын

Па 7 саўгасах Касьцюковіцкага раёну на 15 верасьня будаўніцтва таварных фэрм было выканана толькі на 88,1%. Прычым найбольшае адсталаньне па будаўніцтве СТФ мела месца ў саўгасе «Брацькавічы», дзе процант выкананьня плянаў будаўніцтва не перавышае 25.

Замест таго, каб перабудаваць работу па-новаму, дырэктары саўгасаў і прадстаўнік Белсельбуду спасылаюцца на «аб'ектыўныя» прычыны і ня прымаюць ніякіх захадаў, каб ліквідаваць наяўныя прарывы. Паміж некаторымі дырэктарамі саўгасаў і Белсельбудам няма ніякай дагаворанасьці ў рабоце. Так, дырэктар саўгасу Сялец кажа, што «пакуль Белсельбуд ня дасьць рабочых, я матар'ялаў падвозіць на будаўніцтва ня буду». Прадстаўнікі з Белсельбуду не згаджаюцца прысылаць рабочых да таго часу, пакуль ня будзе надвезен матар'ял.

У выніку будаўніцтва забясьпечана рабочай сілай па ўсіх саўгасах ня больш, як на 50 проц. Між тым вярбоўка рабочай сілы да гэтага часу прадастаўлена самацёку. Ёсьць выпадкі, калі, ня гледзячы на недахват матар'яду, саўгасны транспарт не выкарыстоўваецца і матар'ялаў не падвозіць. Адсутнасьць растлумачальнай работы сярод калгаснікаў прыводзіць да таго, што рад калгасаў адмаўляюцца пасылаць на будаўніцтва рабочую сілу. Праўда, з некаторымі калгасамі заключаны па гэтым пытаньні дагаворы, але яны ня выконваюцца (калгас «Чырвоная вішня» і інш.).

У радзе выпадкаў дырэкцыі саўгасаў зусім ня цікавяцца справай рабочага забясьпячэньня. Ёсьць значная запазычанасьць па зарплаце рабочым саўгасаў.

Сельпарткомы, парт'ячэйкі і рабочыя камітэты гэтых саўгасаў не павярнуліся тварам да вытворчасьці, работы па-новаму не перабудавалі. У саўгасах Канічы, Сялец і Гаўрылінка няма старшынь рабочых камітэтаў.

Трэба адзначыць, што Касьцюковіцкі райком партыі таксама вельмі мала займаўся пытаньнямі работы саўгасаў. Толькі 21 верасьня пытаньне аб будаўніцтве ў саўгасах разглядалася бюро РК КП(б)Б, на якім быў намечан рад практычных мерапрыемстваў па ліквідацыі прарываў у будаўніцтве СТФ. Сельпарткомы і партыйныя ячэйкі на аснове перабудовы сваёй работы па-новаму ўвінны гэтыя мерапрыемствы ажыцьцявіць у самы кароткі тэрмін.

Э. Д—юн.

„Для сіласаваньня няма сырцу"

Па саўгасах Капыльскага раёну маюць месца значныя прарывы па сіласаваньні. Ня гледзячы на тое, што ў саўгасе «Доктаравічы» ёсьць пабудаваная ў гэтым годзе сіласная вежа і што работа па сіласаваньні ў гэтым саўгасе распачата яшчэ 10 верасьня, плян па сіласаваньні выканан ня больш як на 50 проц. Зараз сіласаваньне ў «Доктаравічах» спынена. Дырэктар саўгасу тлумачыць гэта тым, што для сіласаваньня няма сырцу. Такое-ж становішча мы назіраем і ў саўгасе Старыца-Лапухі.

Яшчэ горш стаіць справа з сіласаваньнем у саўгасе «Рымз» дзе яшчэ да гэтага часу ўсё яшчэ рыхтуюцца пабудаваць сіласныя траншэі. Адна траншэя ў гэтым саўгасе была пабудавана, на якую затрачана каля 3-х тыс. руб. У выніку таго, што будаўніцтва яе праходзіла без належнага кантролю, зараз яна абвалілася і для сіласаваньня непрыгодна.

Такое становішча з сіласаваньнем і ўкамплектаваньнем СТФ па саўгасах Капыльскага раёну, зьяўляецца вынікам таго, што сельпарткомы і партыйныя ячэйкі гэтых саўгасаў не займаюцца пытаньнямі вытворчага жыцьця, не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з вытворчымі задачамі саўгасаў.

П.

40-процантны адыход—ганьба для ячэйкі

У саўгасах Чавускага раёну вельмі дрэнна пастаўлена матар'яльна-бытавое абслугоўваньне рабочых. Арганізацыя работы таксама пастаўлена дрэнна. Зьвязьшчына ня ўведзена, сацпаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнуты.

На будаўніцтве ў саўгасах ёсьць значныя прарывы. Па двух саўгасах пабудова матачнікаў выканана толькі на 45 проц, а ў адным з саўгасаў зусім яшчэ не распачыналася. Такое-ж становішча мае месца і ў будаўніцтве ізаляцараў, сталоўкі і жыльлёвых памяшканьняў. Праўда, САЎГАСЫ «ЯЛАВА», «ПАЎЛАЎКА» і «ВОЙНІЛЫ» МАЮЦЬ ЗНАЧНЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ Ў СПРАВЕ ЎКАМПЛЕКТАВАНЬНЯ СЬВІНАМАТАК. Аднак, трэба адзначыць, што ў гэтых саўгасах надзвычай мала ўвагі аддаецца догляду сьвіней, у выніку чаго Ў «ЯЛАВЕ» і «ВОЙНІЛАХ» АДЫХОД ПАРАСЯТ ЧАСТА ПЕРАВЫШАЕ 40-50 проц.

Р. З.

11-ты РЭЙД УДАРНІКАЎ „ЗЬВЯЗДЫ"

АПРАНУЦЬ У КАМЕНЬ ДАРОГІ БССР!
ДА 15-га КАСТРЫЧНІКА ПЛЯН ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА ПАВІНЕН БЫЦЬ
выканан!

Нядаўна брыгады ўдарнікаў «Зьвязды» абсьледавалі становішча дарожнага будаўніцтва па БССР. Рэйд меў мэтай правяраць, як выконваюць цэнтральныя ўстановы дырэктывы ЦК КП(б)Б аб правядзеньні месячніка штурму прарываў у дарожным будаўніцтве.

Рад раённых арганізацый — Лепельскага, Бешанковіцкага, Мазырскага, Наскага, Раўлянскага і інш. раёнаў не аддаюць належнай увагі пытаньням дарожнага будаўніцтва. Вельмі кепска стаіць справа з забясьпячэньнем рабочай сілай.

Дагаворы з калгасамі на вярбоўку рабочай сілы выконваюцца нездавальняюча; многія раённыя арганізацыі нічога не зрабілі, каб дапамагчы дарожным дыстанцыям у вярбоўцы рабочых. У выніку дарожныя работы забясьпечаны рабочай сілай толькі на 51 проц, гужавой сілай — на 27,3 проц., грабарамі — на 48,9 проц.

ЦК ЛКСМБ у свой час даў дырэктыву мабілізаваць 2000 камсамольцаў на дарожнае будаўніцтва. Некаторыя раёны па-бальшавіцку выканалі дырэктыву аб мабілізацыі камсамольцаў. Чэрвеньскі раён атрымаў заданьне паслаць 200 чалавек, паслана 250. Расоны павінны былі мабілізаваць 70 чал. Заданьне выканалі мабілізаваць 70 чал. Бярэзінскі раён пры нана поўнасьцю. Бярэзінскі раён пры кантрольнай лічбе ў 100 чал., паслаў 170 і г. д. але большасьць раённых арганізацый не ажыцьцявіла дырэктывы ЦК камсамолу. Менск павінен быў паслаць 100 чал., не паслана ні аднаго. Бяльнічы замест 100 чал. паслалі 15. Пухавічы замест 200 паслалі 62 і г. д.

Дрэннае выкананьне заданьня тлумачыцца адсутнасьцю масава-растлумачальнай работы сярод камсамольцаў аб значэньні мабілізацыі на дарожным будаўніцтве, нездавальняючым абслугоўваньнем на дарожных работах пасланых камсамольцаў, што выклікала ўход з работы многіх з мабілізаваных. ЦК ЛКСМБ паслаў на раёны 5 інструктароў для правэрки ходу мабілізацыі, але ня ўжыты належныя меры да тых райкомаў, якія ня выканалі дырэктыў.

Паводле пляну, штодзённа павінна быць завезена 150 ваг. каменьня. Прыбывае ў дзень толькі 5-6 вагонаў, з-за дрэннай падачы паражняку.

Дрэнна адбівалася на працы тое, што вучасткі, якія падпераднаваны нарабам вельмі вялікія, і адміністрацыі вельмі цяжка кіраваць працай на іх. Зараз паўстала пытаньне аб разбуйненьні вучасткаў, каб кожны вучастак быў ня больш 200 клм., гэта павінна значна палепшыць работу.

МЭХАНІЗАЦЫЯ І РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ДАРОЖНЫХ РАБОТ — адно з самых слабых зьвеньняў дарожнага будаўніцтва. Дагэтуль не ліквідавана вялізнічка ў абслугоўваньні машын. Ня прынятыя меры да ўзьняцьця кваліфікацыі рабочых, якія працуюць ля мэханізмаў. Адсюль факты частага псаваньня машын. У Лепацкім раёне абоз з 18 машын стаіць без працы, бо чыгунка не падвозіць матар'ялу.

Сэктар рацыяналізацыі і мэханізацыі Дарбуду не наладзіў уліку эфэктыўнасьці ўжываньня машын на дарожным будаўніцтве. Ёсьць выпадкі, калі машыны трапляюць не на тыя дыстанцыі, куды яны прызначаны, і доўга стаяць без работы. Напрыклад, нядаўна былі вышлісаны з Масквы 13 машын у адрас Менску, але чамусьці яны трапілі на ст. Пухавічы.

ПРАФСЭЫЯНАЛЬНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ СТАЛІ НА ЧАЛЕ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА НА ДАРОЖНЫХ РАБОТАХ.

Дагэтуль не праводзілася праверка сацдагаворў 4 іх выкананьня. Сацспаборніцтвам на работах охоплена толькі каля 30 проц. дарожных рабочых.

Прэміяльны фонд у суме 18,700 руб., амаль не скарыстоўваецца. Выдана толькі 915 руб. Сэктар эканомікі і быту саюзу ня мае вестак аб тым, колькі заключана сацдагаворў. Не ведаюцца ўліку эканамічнага эфэкту сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

З акцыянэрным таварыствам «Установка» быў заключаны дагавор на падрыхтоўку 2500 каменщыкаў, якія ў жніўні павінны былі прыступіць да работы. Падрыхтавана толькі 500 чал.

Брыгады вылавілі, што Белкавпасаюз зусім ня мае вестак аб тым, як задавольняюцца прадуктамі рабочыя дарожнага будаўніцтва. «Мы далі нарады, задаволілі залучні»,— зьяўляюць работнікі Белкавпасаюзу. Весь і ўсё!

Агульны вывад: да канца сэзону дарожных работ засталося вельмі мала часу. Цяперашняе становішча з выкананьнем пляну дарожнага будаўніцтва патрабуе фарсаваньня тэмпаў работы. Усе раённыя арганізацыі і ўстановы павінны павярнуцца тварам да дарожнага будаўніцтва. Плян дарожных работ павінен быць поўнасьцю выканан. Трэба апрануць дарогі БССР у каменную вопратку, а эканоміць мільёны рублёў, якія штогод траціць дарожная гаспадарка з-за бездарожжа.

Брыгады «Зьвязды»: ЯРЫГА, ПІХАТОЎСКІ, ДУБРОЎСКІ, БЫКАЎ, ЛІБІН, БАРШАЙ, СЕРАФІМОВІЧ, ГАНЧАРЭВІЧ, ТЭРАЎСКІ, РЭЎТ, КРАЖАЧКОЎСКІ, ВЕРАМЕЕЎ, ШАХАВЕЦ, ЛЯПЕШКА, НАРКЕВІЧ, КУРЫЛАВА, ПЯЎЦОВА, ЛОСЕЎ, ВАЛЬКОВІЧ, РАМАНОЎСКІ, РУДЗІЧ І КАЦНЭЛЬСОН.

Навучальны год

Упарта змагацца
за рэалізацыю пастановы ЦК Усе КП(б) аб школе

Убраць апартуністычныя рагаткі са шляху ўсеагульнага навучаньня

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб сярэдняй і пачатковай школе паставіў рад адказных задач ня толькі перад органамі нарасьветы, але і перад усімі партарганізацыямі і ўсёй савецкай грамадзкасьцю.

Канстатуючы, што наша школа мае вялізарныя дасягненьні ў сваім разьвіцьці, у ажыцьцяўленьні прынцыпаў камуністычнага выхаваньня, ва ўкараненьні палітэхнізацыі — неабходнай умовы падрыхтоўкі кадраў, — ЦК УсеКП(б) адзначасова адзначыў, што савецкая школа яшчэ далёка не адпавядае тым патрабаваньням, якія ёй прад'яўляюцца сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва.

Савецкая школа ў новых умовах, у новай абстаноўцы павінна працаваць па-новаму, прыстасоўваць усю сваю работу да запатрабаваньняў сацыялістычнага будаўніцтва, да задач «падрыхтоўкі ўсебакова разьвітых членаў камуністычнага грамадзтва».

Між тым, у справе палітэхнізацыі школы ў радзе месц дапушчаны грубыя памылкі, якія безадкладна павінны быць ВЫПРАЎЛЕНЫ. Палітэхнізацыю сям-там зразумелі, як адмаўленьне ад агульна-асьветных дысцыплін, як вузка-пэхавую падрыхтоўку вучняў. Такая «палітэхнізацыя», бясспрэчна, ня мае нічога агульнага з установкамі партыі па гэтым пытаньні.

«Усякая спроба адарваць палітэхнізацыю школы ад сыстэматычнага і моцнага ўсваеньня навук, асабліва фізыкі, хэміі і матэматыкі, выкладаньне якіх павінна быць пастаўлена на аснове строга вызначаных, дакладна распрацаваных праграм, вучэбных пляноў і праводзіцца па строга-ўстаноўленым раскладзе, зьяўляецца грубейшым скажэньнем ідэі палітэхнічнай школы» (з пастановы ЦК УсеКП(б).

Палітэхнізацыя школы ня можа праводзіцца абстрактна, адарвана ад сутнасьці, яна павінна шчыльна ўвязвацца з канкрэтнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Матар'ялы, якія мы сёньня зьмяшчаем, з усёй выразнасьцю паказваюць, што пытаньням палітэхнізацыі не аддаюць патрэбнай увагі многія органы нарасьветы і партарганізацыі. У гэтым пытаньні мы павінны дабіцца тэрміновага і рашучага пералому.

За палітэхнізацыю школы адказваюць і партыйныя ячэйкі, і рабочыя камітэты прадпрыемстваў, а ня толькі настаўнікі ці асьветніцкія арганізацыі.

Ужо больш месяца, як пачаўся навучальны год. Між тым, мы і зараз яшчэ ня маем дакладнай і патрэбнай работы школьнай сыстэмы па ажыцьцяўленьні ўсеагульнага навучаньня. Той факт, што па-за школай яшчэ засталося шмат дзяцей, прымушае нас з усёй рашучасьцю завастрыць пытаньне на рабоце мясцовых органаў нарасьветы, аб якасьці кіраўніцтва партыйных камітэтаў і ячэек пытаньнямі асьветы.

Многія школы ў тэрмін не пабудаваны і не адрамантаваны. Кіраўнікі будаўнічых арганізацый, якія па сутнасьці ў радзе раёнаў паставілі пад пагрозу навучальны год, ня прыцягнуты да адказнасьці, не абавязаны па-ўдарнаму скончыць рамонт і будаўніцтва школьных будынкаў. Простая бязьдзейнасьць райінспэктарыятаў сацвыху ў справе матар'яльнага забясьпячэньня школ, забясьпячэньня настаўнікаў паводле пастаноў партыі і разбазарваньне настаўніцкіх кадраў выклікаюць неспакой за пасьпяховае правядзеньне ўсеагульнага навучаньня ў асобных раёнах.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па нецярпімай бязьдзейнасьці каапэрацыйных арганізацый у справе забясьпячэньня вучняў гарачымі сьнеданьнямі, абуткам, вопраткай і навучальнымі прыладамі.

Партыйныя ячэйкі павінны ўзяць пад свой неаслабны кантроль усю работу па правядзеньні ўсеагульнага навучаньня і па ліквідацыі непісьменнасьці, павінны аказаць канкрэтную дапамогу органам нарасьветы па мабілізацыі ўсіх асьветніцкіх кадраў на пэдагагічную работу, выкрыць сапраўдныя прычыны зрыву школьнага будаўніцтва і прыцягнуць да адказнасьці апартуністаў, якія тармозяць усеагульнае навучаньне.

Адвесьці пагрозу

Гаспадарчыя і каапэрацыйныя арганізацыі ВІЦЕБСКУ не прынялі належных захадаў да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб сярэдняй і пачатковай школе.

Будаўнічыя арганізацыі працуюць недапушчальна павольнымі тэмпамі. Будканторы ня выкакала дырэктыў аб скончэньні да пачатку навучальнага году. БУДАЎНІЦТВА СЯМІГОДКІ Ў АДНЫМ З БУЙНЕЙШЫХ РАБОЧЫХ РАЁНАЎ — ПРАЛЕТАРСКАЙ СЛАБАДЗЕ.

У сувязі з гэтым, усеагульнае навучаньне пастаўлена пад пагрозу. Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што ніякіх прычын, якімі-б маглі апраўдацца кіраўнікі будканторы, няма. Ёсьць толькі непаваротлівасьць і ганебная стаўка на самацёк.

Навучальны год пачаўся, але яшчэ далёка не адрамантаваны ўсе школы, ня вызвалены школьныя будынкі. На сёньнішні дзень некалькі дзесяткаў сем'яў жывуць у школьных памяшканьнях, ня маючы ніякага дачыненьня да школы. Асобныя школьныя будынкі заняты пад склады Саюзхлеба і г. д. Гаржыльсаюз і Камгас ігнаруюць дырэктыву аб тэрміновым вызваленьні школьных будынкаў. І гэта робіцца ва ўмовах вялікага недахвату школьнай плошчы.

Маюць месца факты зусім нецярпімых адносін гаспадарнікаў да справы ажыцьцяўленьня палітэхнізацыі ў школах. Заводы-кіраўніцтвы многіх прадпрыемстваў адмовіліся выпускаць інструктароў па палітэхнізацыі. Больш таго, КІРАЎНІЦТВА АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ АДМОВІЛАСЯ ПРЫМАЦАВАЦЬ ДА ФАБРЫКІ ЛАТЫСКУЮ І РАСІЙСКУЮ ШКОЛЫ. На акулярнай фабрыцы ня выконваецца дырэктыва партыі аб школе, ня прымаецца ніякіх захадаў да правільнага правядзеньня палітэхнізацыі, ганебна ігнаруецца задача перабудовы школы.

Посьпех навучальнага году і асабліва ў ажыцьцяўленьні ўсеагульнага навучаньня ў значнай меры залежыць ад таго, як каапэрацыйныя арганізацыі здолеюць забясьпечыць вучняў гарачымі сьнеданьнямі, абуткам, вопраткай і навучальнымі прыладамі. Віцебскі-ж ЦРК выдае замест 12.000 — 8.000 сьнеданьняў. Але справа ня толькі ў колькасьці. Якасьць гэтых сьнеданьняў зусім нізкая.

Сьнеданьні гатуюцца абы з рук збыць, у сталоўках не захоўваюцца санітарна-гігіенічныя патрабаваньні і г. д. Пакуль што праўленьне ЦРК не прыняло ніякіх захадаў да паляпшэньня якасьці сьнеданьняў. Зусім нецярпімым зьяўляецца становішча з забясьпячэньнем дзяцей абуткам. На 15.200 вучняў выдана толькі 2.000 пар абутку.

Мы патрабуем ад гаспадарчых арганізацый і ў першую чаргу ад каапэрацыйных дакладнай работы па рэалізацыі пастановы ЦК. Каапэрацыйныя работнікі, якія забясьпечваюць вучняў нікуды нягодными сьнеданьнямі і нізкаякасным абуткам, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

М. Г.

Школам—настаўнікаў

Гэтымі днямі калегія Наркамасьветы разгледзела рад важнейшых пытаньняў аб правядзеньні ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці, аб кадрах настаўнікаў для школ, забясьпячэньні вучняў гарачымі сьнеданьнямі, абуткам, вопраткай і навучальнымі прыладамі і г. д.

Даклады з месц паказалі, што многія партарганізацыі не прынялі ўсіх неабходных мер для рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб сярэдняй і пачатковай школе.

Асьветніцкія арганізацыі многіх раёнаў недаацэньваюць вялізарнага палітычнага значэньня задач усеагульнага навучаньня. Масы асьветнікаў невыстарчальна мабілізаваны на непасрэдны актыўны ўдзел за ўсёй рабоце па пасьпяховым правядзеньні навучальнага году.

Паводле прыблізных і далёка няпоўных падлікаў зараз не хапае больш чым 1.000 настаўнікаў для першага канцэнтру школ і каля 200 настаўнікаў для другога канцэнтру. Недахват настаўнікаў тлумачыцца тым, што раённыя кіруючыя арганізацыі не прынялі ніякіх захадаў па мабілізацыі асьветніцкіх кадраў на мясцох.

Райвыканкомы і органы прафсаюзу асьветнікаў для паасобных катэгорый настаўнікаў ня склалі спрыяючых умоў для работы. У Бягомльскі раён, як у прымежны, Наркамасьветы было накіравана 10 настаўнікаў-камсамольцаў. У раёне камсамольцаў спаткалі вельмі дрэнна: не забясьпечылі кватэрамі, не дапамагалі ў рабоце. У рэзультаце гэтага камсамольцы-настаўнікі пакінулі школы і выехалі за межы раёну. Факт дэзэртырства камсамольцаў з пэдагагічнай работы павінен быць рашуча асуджан, але гэта ні ў якім разе ня зьнімае адказнасьці з органаў нарасьветы і прафсаюзу за нецярпімыя адносіны да настаўнікаў.

Такое становішча назіраецца ня толькі ў Бягомльскім раёне. Ня гледзячы на жорсткую дырэктыву ЦК УсеКП(б) аб забясьпячэньні настаўнікаў у гарадох і ў сельскіх мясцовасьцях нароўні з прамысловымі рабочымі, мясцовыя органы ніколькі не палепшылі забясьпячэньня настаўніцтва. У Веткаўскім раёне каапэрацыйныя арганізацыі адмовіліся забясьпечваць настаўнікаў абуткам, у Віцебску павысялялі асобных настаўнікаў з кватэр.

Адначасова мы павінны падкрэсьліць, што ёсьць імянёны сярод паасобных настаўнікаў кінуць работу ў вёсцы і асесьці ў горадзе. Асьветніцкія прафсаюзныя арганізацыі павінны рашуча змагацца з гэтымі імкненьнямі, стараючы адначасова матар'яльныя базы для вясковага настаўніка.

Улічваючы вялікі недахват настаўніцкіх кадраў і зрыў запяткаў удзесятках школ на вёсцы, калегія НКА прыняла пастанову аб безадкладным накіраваньні на практыку студэнтаў пэдкурсаў і пэдагагічных інстытутаў. Гэта ні ў якім разе ня зьнімае адказнасьці з раённых арганізацый за справу падпускаваньня і выкарыстаньня на пэдагагічнай рабоце мясцовых асьветніцкіх сіл. Калегія НК-Асьветы прапанавала прыцягнуць да адказнасьці інспэктароў сацвыху, якія разбазарваюць настаўніцкія кадры і даваляюць настаўнікам пераходзіць на іншую работу, ня зьвязаную з пэдагагічнай дзейнасьцю.

У радзе раёнаў у школах заняткі не пачаліся толькі таму, што не адрамантаваны школьныя будынкі і не адкрыты новыя камплекты. Па прыблізных падліках дагэтуль не ахоплена каля 50.000 дзяцей першага канцэнтру і каля 3.000 другога канцэнтру. Будаўніцтва школ злачынна зацягваецца. Дзесяткі школ будуюцца па 2-3 гады. Органы Наркамасьветы і будаўнічыя арганізацыі ў справе будаўніцтва і рамонту школ праяўляюць недапушчальную бязьдзейнасьць, прыкрываючыся аб'ектыўнымі прычынамі і па сутнасьці ставяць пад пагрозу зрыву правядзеньне ўсеагульнага навучаньня. Клімавіцкі, Прапойскі, Заспаўскі і Чаўускі раёны сарвалі будаўніцтва і рамонт школ. У гэтых раёнах па працягу ўсяго будаўнічага сэзону не пабудавана ні адна новая школа, і такім чынам, ня выкананы дырэктыва ўраду аб адкрыцьці новых канцэнтраў.

У Наркамасьветы паступаюць шматлікія скаргі ад інспэктароў сацвыху аб нецярпімых адносінах органаў спажывецкай каапэрацыі да забясьпячэньня вучняў гарачымі сьнеданьнямі, вопраткай, абуткам і навучальнымі прыладамі. Райспажыўсаюзы Лоўсызга і Чаўускага раёну яшчэ не лабілі ніводнай пары абутку для вучняў. Грамадзкае харчаваньне ня толькі не паладжана ў вясковых раёнах, але і ў такіх буйных прамысловых цэнтрах, як Гомель, Віцебск і іншыя.

Калегія Наркамасьветы адзначыла зусім недападальняючую работу райінспэктароў сацвыху і грамадзкіх арганізацый па ліквідацыі няпісьменнасьці. Дагэтуль няма дакладных вестак аб процантным охопе ліквідуктамі няпісьменных і школамі малапісьменных. У Магілёўскім, Барысаўскім, Касьцюковіцкім і ў радзе іншых раёна

АРШАНСКІ ЧЫГУНАЧНЫ ВУЗЕЛ— КАНДЫДАТ НА УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС

ДЭПО ВОРША. Ударны паравоз імя газэты «РАБСЕЛЬКОР». На здымку (у вакне) машыніст МІКУЛАЎ, лепшы ударнік, член ЦВК БССР; ніжэй — падмачнік машыніста тав. РАТКЕВІЧ. Паравоз пераведзен на гаспадарчы разрахунак.

Рэалізуючы ўказаньні тав. Сталіна, аршанскія чыгуначнікі пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі выводзяць вузел з паласы прарываў

АРШАНСКІ чыгуначны вузел зьяўляецца адным з важнейшых вучасткаў МБЕ чыг. Між тым, ён на працягу доўгага часу ня выходзіў з паласы прарываў.

З месяца ў месяц вымяральнікі трансфінплану ня выконваліся, была нізкая прадукцыйнасьць, слаба разгортвалася сацыялістычнае спаборніцтва.

За апошнія тры месяцы Аршанскі вузел шляхам перабудовы работы пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, шляхам паўхільнага правядзеньня ў жыцьцё пастаноў чэрвеньскага пленуму ЦК УсесКП(б) аб чыгуначным транспарце і ўказаньняў тав. Сталіна,—ДАБІЎСЯ ПА ВАДЗЕ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ ЗНАЧНЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ.

Усесаюзны конкурс на лепшае дэпо, станцыю, акалодак, брыгаду, машыніста, які зараз праводзіцца, яшчэ больш узьняў энтузіязм рабочых-чыгуначнікаў на лепшае выкананьне вымяральнікаў.

Аршанскі вузел у цэлым прызнан лепшым на МБЕ чыг. і ўзаходзіць кандыдатам на ўсесаюзны конкурс.

Дэпо ВОРША па правядзеньні спаранай язды на паравозах у маі і чэрвені мела вялікі прарыў. У гэтым была віна ня толькі дэпо, але ў большай ступені і дырэкцыі дарогі, якая ўносіла блытаніну ў правядзеньне спаранай.

Цяпер гэты прарыў ЛІКВІДАВАНЫ. Паводле матар'ялаў камісіі партарганізатара раёну, фактычнае правядзеньне спаранай складае:

за ліпень—**83,83 проц.**, за жнівень—**88,92 проц.**, за першую палову верасьня—**90,4 проц.**

Трэба адзначыць, што правядзеньне спаранай яшчэ не даволі замацавана. Зрывы спаранай у большасьці бываюць з-за качагараў. Дэпо павінна зьнішчыць перакідку качагараў з аднаго паравоза на другі.

За апошні час дасягнуты пералом у справе паляпшэньня якасьці рамонту. У маі быў 91 выпадак паўторнасьці рамонту паравозаў, у чэрвені—65, у ліпені—36, у жніўні—28 і за першую палову верасьня [illegible]

Сярэдні [illegible] прабег пасажырскага паравозу пры норме ў 255 клм. перавыкананы. За ліпень прабег складае 305,6 клм., за жнівень—298 клм., за дзьве дэкады верасьня—324,8 клм.; прабег таварнага паравоза пры заданьні ў 188 клм. складаў за ліпень 173 клм., за жнівень—172,7 клм., за першую дэкаду верасьня—156,6 клм. і за другую дэкаду—198,8 клм.

Прастой паравозаў на халодных прамыўках пры норме ў 52 гадзіны складаў у ліпені 58,4, у жніўні—50,7. За дзьве дэкады верасьня прастой складалі толькі 51,6 гадзіны. На гарачых прамыўках пры норме ў 14 гадзін у ліпені прастой складалі 12,5, жніўні—9,7, за дзьве дэкады верасьня—11,6 гадзін.

Прастой паравозаў у абточцы пры норме ў 6 дзён у верасьні складаў 8,5 дня. Гэта здарылася часткова таму, што, начынаючы з вясны і да гэтага часу, усё яшчэ праводзіцца перабудова дэпо па абточцы. Кіраўнікі дэпо нагул не паставілі абточку на належную вышыню. Электрычнае абсталяваньне для падыманьня паравозаў доўгі час не скарыстоўвалася.

Брыгадзе па абточцы прыходзіцца траціць на падыманьне паравоза замест 15 мінут 7-8 гадзін. Разабраныя часткі паравоза кладуцца тут-жа на падлогу, бо для іх няма прыстасаванага месца.

У выніку некаторыя часткі губляюцца, а другія расьцярваюцца на іншыя паравозы. Пры сканчэньні абточкі брыдзе прыходзіцца рабіць новыя часткі, на што траціцца 1-2 сутак. Самі гаспадарчыкі дэпо нярэдка даюць распарадженьні браць з паравоза абточкі некаторыя часткі: падшыпнікі, кулісы і інш. для другіх паравозаў, чым павялічваецца прастой.

Процант хворых паравозаў складаў у верасьні 14,9 проц. пры норме ў 10 проц.

Пасьля разьбіўкі ўсіх майстроў, сьлесароў і рабочых дэпо на малыя брыгады, групы і ўвядзеньня зьдзельнай аплаты працы, усе цэхі дэпо БЫКОНВАЮЦЬ заданьні, а некаторыя цэхі нават ПЕРАБЫКОНВАЮЦЬ іх. Так, за жнівень выканалі заданьні:

АРМАТУРНАЯ БРЫГАДА—на 257 проц., ДЫШЛАВАЯ — на 219 проц., ПОРШНЕВАЯ—на 159 проц., КАЦЕЛЬНАЯ—на 162 проц., ГАРНІТУРНАЯ—на 159 проц., ЭКІПАЖНАЯ—на 175 проц., БРЫГАДЫ ПА КАНСЭРВАЦЫІ — на 145 проц., АЎТАМАТЧЫКАЎ—на 172 проц., СЬЛЕСАРЫ бягучага рамонту—на 162 проц.

Неабходна адзначыць прыкладную работу БРЫГАДЫ АЎТАМАТЧЫКАЎ. Старэйшым брыгадзірам яе зьяўляецца лепшы ўдарнік-вынаходца тав. ЛЫСІКОВІЧ.

Пры дэпо ёсьць ячэйка вынаходцаў.

Дэпо Ворша. Ударнік-вынаходца т. Зубкоў.

Вынаходцамі ўнесена шмат каштоўных прапаноў. Вельмі каштоўныя вынаходзтвы дырэкцыяй часта не рэалізуюцца: так вынаходзтва Лысікавіча—прэс-масьлёнка і сыфон Аварэвіча—марынуюцца больш двух гадоў, тады, як гэтыя вынаходзтвы вельмі каштоўныя і далі-б вялікую эканомію.

СЛАБЫМ МЕСЦАМ у працы дэпо зьяўляецца правядзеньне гаспадарчага разрахунку. З усіх брыгад пераведзена на гаспадарчы разрахунак толькі брыгада па кансэрвацыі і частка паравозаў, што зьяўляецца зусім невыстарчальным.

ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК на паравозах поўнасьцю сябе АПРАЎДАЎ. За першы месяц работы на гаспадарчым разрахунку ўсе паравозы далі эканомію, ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎШЫ заключаныя дагаворы.

Брыгада паравоза сэрыі Су 97-64 імя газэты «Рабселькор» дала эканоміі на 201 руб. 14 кап. (у гэту суму не ўваходзіць эканомія апалу), сэрыі О-в №-4744—на 257 руб. 4 кап., сэрыі Ов №-4663—420 руб. 40 кап., сэрыі Щ №-573 імя газэты «Гудок»—117 р. 77 к. і інш.

Яшчэ ў ліпені месяцы агульны сход паравозьнікаў пастанавіў аб пераводзе на гаспадарчы разрахунак ня менш 50 проц. паравозаў, але кіраўнікі дэпо марудзяць з гэтым. Для гаспадарча-разрахунковых брыгад ня створаны належныя ўмовы, расцэнак на ўсе часткі і матар'ялы няма, аб выніках працы за месяц брыгады даведваюцца толькі ў канцы будучага месяца.

КАНТОРА ДЭПО не перабудавала сваёй работы. Загадчык канторы т. Прыстром заяўляе: «вынікі гаспадарчага разрахунку можна даць за жнівень прыкладна 2-4 верасьня, але-ж у нас ёсьць іншая работа».

У ГАЛІНЕ ЭКАНОМІІ АПАЛУ дэпо таксама мае ДАСЯГНЕНЬНІ. За другі квартал з'эканомлена вугалю 1.033 тоны на суму звыш 20.000 руб.

Ёсьць паравозныя брыгады, якія кожны месяц даюць эканомію апалу. За ліпень далі вялікую эканомію брыгады машыністаў: ЗДАНОВІЧА — 9.043 кгр., АЗАРЭВІЧА — 6.407 кгр., ШЭЙНА—7.809 кгр., МАРОЗАВА—6.299 кгр., ЧУПРЫНА—5.241 кгр. і інш.

Але ёсьць і такія брыгады, якія замест эканоміі даюць перапал. Запазычанасьць апалу лічыцца з машыністаў—Ясінскага на суму 174 р. 98 к., Кгіна—128 р. 32 к., Люся—90 р. 75 к., Танчэўскага—97 р. 55 к., Пуцыла—54 р. 28 к.

Цэхавыя камітэты яшчэ не даволі своячасова рэагуюць на кожны выпадак парушэньня працоўнай дысцыпліны. Вытворча-таварыскі суд ня справіўся з ускладненымі на яго задачамі.

Станцыя Ворша яшчэ да пачатку трэцяга кварталу мела значныя дасягненьні ў выкананьні вымяральнікаў. Адпраўлена ў ліпені пасажырскіх цягнікоў па раскладзе 97,1 проц., у жніўні—98,1 проц. за дзьве дэкады верасьня—98 проц.; таварных—у ліпені 95,6 проц., жніўні—96 проц., за дзьве дэкады верасьня—97 проц.

Каэфіцієнт манэўровых работ выканан у ліпені на 104,5 проц., у жніўні—на 103,5 проц. і за дзьве дэкады верасьня—106,6 проц.

Лепшымі работнікамі па станцыі прызнаны журы раёну і дырэкцыі т.т. РЫЖОЎ, ГАРБАЧОЎ, ПАДАБЕД, КУР'ЯНАЎ, ЕМАСЮКЕВІЧ, ЧАРНЯЎСКАЯ, МЯДЗЬВЕДЗКІ і малодшы ЛЕАНОВІЧ; па разгрузачна-разгрузачных работах — брыгада ЭЙДЗІНАВА, ГОЛЬДБЭРГА і ЯСЬЛІКАВА; лепшымі дыспэтчарамі т.т. НАГІВОВІЧ, БАРАШКА, САЧЫЎКА і КРЭСІК.

Па дэпо Ворша за выкананьне і перавыкананьне норм прабегу, нагон у дарозе, эканомію апалу, адсутнасьць спазьненьняў і добры догляд паравозаў прызнаны лепшымі машыністамі па пасажырскіх цягнікох т.т. МІКУЛОВІЧ С., машыніст ударнага паравозу № 97-64 імя «Рабселькор»; **ТУРЧЫНОВІЧ, ЯНКУЛЯЎ і ЧУЯРЫН** на таварных т. т. **МАРОЗАЎ К.**—машыніст ударнага паравоза № 573 імя газэты «Гудок», тав. **САВІЦКІ** — машыніст ударнага паравоза № 3005 імя Кліма Варашылава, **ДАЙНЭКА М., БАКУМЕНКА, ЗДАНОВІЧ, ІГНАТОВІЧ, РЫЖАНСКІ, ВЫСОЦКІ, ЛЮБЕЦКІ В. і КАЧАТКОЎ.**

На службе шляху прызнаны лепшымі і выстаўлены першымі кандыдатамі на ўсесаюзны конкурс 3-я арцель ст. Спаўнае—т.т. **КАЖАМЯКА, БЛІЗЬНЯЦОЎ, ЛАПАРЭВІЧ, СУРДА, КРАСНОЎ, КОЗІК ВАСІЛЬ і ХАДАСЕВІЧ;** 3-я арцель ст. Талачын т.т. **ГАЛЕВІЧ, ГОБЕЦ, ІГНАТОВІЧ, СЯРГЕЕЎ, СУДНІК, КУЛІК, ГАНЧАРОЎ і МЕЛЯШКЕВІЧ.** Гэтыя арцелі перавыканалі вымяральнікі у 1930 і 1931 гадох. За ўвесь час паказаныя арцелі зьмяняюць па 30-31 шпале ў дзень на кожнага чалавека.

Вопыт іх перадан многім арцелям іншых акалодкаў 3-га раёну, якія таксама пачалі зьмяняць па 25-28 шпал. Арцелі прэміраваны.

Не здаючы тэмпаў у рабоце, чыгуначнікі павінны з яшчэ большым энтузіязмам і энэргіяй змагацца за найлепшае выкананьне дырэктыў партыі па правядзеньні асеньня-зімовых перавозак.

Я. ПРАКАПОВІЧ.

„УКАРАНІЦЬ І ЎМАЦАВАЦЬ ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК— ТАКАВА ЗАДАЧА" (І. СТАЛІН)

КІРАЎНІЦТВА ФАБРЫКІ ІМЯ КРУПСКАЙ ІГНАРУЕ ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК

«Укараніць і ўмацаваць гаспадарчы разрахунак, узьняць унутры-прамысловае накапленьне — такава задача» (Сталін).

Як-жа гэта задача, пастаўленая правадыром партыі перад арганізацыямі нашай прамысловасьці, канкрэтна вырашаецца па **меншай шчотачнай фабрыцы імя Крупскай?**

Яшчэ ў маі на фабрыцы частка брыгад былі пераведзены на гаспадарчы разрахунак. На сёньняшні дзень такіх брыгад на фабрыцы налічваецца **15.**

Пераводзіліся гэтыя брыгады на гаспадарчы разрахунак бяз усякай глыбокай прапрацоўкі гэтага пытаньня сярод рабочых і работніц. Адміністрацыя склала праекты дагавароў, пагаварылі на сходзе і на гэтым паставілі крапку. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі цэхаў амаль ня прымалі ўдзелу ў справе пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Цэхавыя парт. і прафарганізацыі не пашлі на лінію мабілізацыі ўвагі рабочых па высоўваньні сустрэчных прапаноў да абавязацельстваў у дагаварох. Нічога ня было зроблена для замацаваньня гаспадарчага разрахунку ў брыгадах.

Спачатку па патрабаваньні камсамольца тав. Элентуха была пераведзена яго брыгада ў ліку 6 чал. на гаспадарчы разрахунак. Брыгада ўзяла на сябе наступныя абавязацельствы:

«Перавыпрацаваць на працягу месяца 6.865,8 кілёграм канцоў конскіх хвастоў, 2.863 кілё падкосу і 172 кілр. грывы».

Брыгада прыняла на сябе на 140 руб. інструментаў, абавязалася трымаць гэтыя інструменты ў захаванасьці. Процант адыходаў давесьці да 12 па конскіх хвастох, па падкосу да 18 і па грыве да 20. Раней адыходаў было значна больш, чым было прадугледжана плянам.

Пачала брыгада працу па-новаму. Старшы брыгадзір штодзенна атрымліваў матар'ялы для перапрацоўкі. Быў жорсткі вучот матар'ялаў, таксама дакладна ўлічвалася работа кожнага рабочага паасобку.

Скончыўся месяц. Брыгала падлічыла свае дасягненьні. Вытворчая праграма была выканана на 107,3 проц. Па ўдзяняцьні прадукцыйнасьці працы плянавы паказальнік перавышан на 13,3 проц. Сабекошт зьніжаўся на 4 проц. звыш пляну. Адыходы паменшаны на 9,2 проц.

На цэхавых выдатках брыгада з'эканоміла 16 руб. На скарачэньні проценту адыходу брыгада тав. Элентуха дабілася 160 руб. эканомі. З гэтай сумы атрымала 50 проц. прэміі.

Неўзабаве брыгада фаніроўшчыц, паліроўшчыц, а за імі і фарбавальшчыцы патрабавалі перавесьці іх на гаспадарчы разрахунак.

Адміністрацыя зноў-такі бяз удзелу мас склала праекты дагавароў і прапанавала іх работніцам. Грамадзкія арганізацыі як цэху, таксама і фабрыкі не зьвярнулі патрэбнай увагі на жаданьне работніц пасьледаваць прыкладу брыгады тав. Элентуха. Не растлумачылі работніцам значэньня гаспадарчага разрахунку.

Кіраўнікі цэхаў першы месяц пасьля пераводу брыгады тав. Элентуха на гаспадарчы разрахунак вялі вучот работы і матар'ялаў, сачылі за работай брыгады, а потым, на другі месяц, не **палічылі патрэбным нават заключыць з брыгадай дагавар.**

Гэта абураючае ігнараваньне рабочай ініцыятывы прывяло да таго, што ў самой брыгадзе атрымаўся разрал. Тав. Элентух пачаў прасіцца ад пераводзе ў другі цэх. Потым ён прасіўся адпусьціць яго на вучобу. Яму ў гэтым адмовілі. Тады тав. Элентух патрабаваў ад адміністрацыі цэху, дапамагчы брыгадзе стаць на ранейшыя рэйкі. У пачаткавага-валасным зьмяніліся кіраўнікі, а падтрымальня з боку партыйных і прафарганізацый тав. Элентух не атрымаў.

Да гэтага часу за ўсіх 15 брыгадах існуе толькі адзін «кут» кіраўніцтва — старэйшыя брыгадзіры, а парт. і прафарганізатары ў брыгадах адсутнічаюць. Ды і брыгадзірам няма чаго рабіць. Іх абязкі зьведзены да таго, што яны наглядаюць за работніцамі, каб апошнія не спрачаліся ў часе працы. **Унутры-брыгаднага вучоту работы няма.**

На фабрыцы не перабудавана партыйная і прафэсыянальная работа у адпаведнасьці з новымі задачамі. **Цэнтр цяжару ўсёй работы не перанесен у цэх і брыгады.**

Старшыня фабкому тав. Сідаровіч працаваць ня хоча. На кожнае пасяджэньне бюро парткалектыву падае заявы, просячы аслабаніць яго ад абавязкаў старшыні фабкому таму, што ён палітычна нязмённы. Час ідзе, а працы няма. Фабком займаецца разглядам канфліктаў паміж адміністрацыяй і рабочымі. Іншыя, бяўмоўна, асноўныя пытаньні вытворчасьці праходзяць мімо ўвагі фабкому.

Не вязнецца выстарчальнай работы па барацьбе з прагуламі і лятунствам. Прычыны — адсутнасьць выстарчальнай колькасьці месц у дзіцячых яслях і дзіцячых садох.

Фармалізму і паверхоўнага падыходу па важнейшых гаспадарчых пытаньнях на фабрыцы колькі хочаш. Вось факты: на паперы праведзена прагрэсыўна-прэміяльная зьдзельшчына. На справе яе няма. Работа рабочага ўлічваецца ня кожны дзень, а ў канцы месяца.

Пашпартызацыя варштатаў праведзена толькі фармальна. Да варштатаў прывешаны формы кніжак пашпартаў, у якіх нават ня зроблены патрэбныя запісы. Ніхто на гэта не зварачае ніякай увагі.

Для таго, каб сапраўды па-новаму кіраваць рабочымі, умела паставіць работу цэху, неабходна ўвесь час быць у цэху. Дырэктар фабрыкі тав. Любін, паводле слоў рабочых, вельмі мала бывае ў цэху. Затое пасяджэньні адміністрацыйна-тэхнічнага і майстэрскага складу ён склікае штодзенна. Не пасьпеў майстар, ці загадчык цэху ўзяцца за справу, а тут ужо дзьве гадзіны. Трэба ісьці на пасяджэньне. І так, кожны дзень ад 2 да 4 пасяджэньні, а пасьля дадому. Раней усе пасяджэньні адбываліся пасьля работы, а зараз засядаюць у часе працы, адрываючы ад кіраўніцтва майстраў і загадчыкаў цэхаў.

Патрэбна з усёй рашучасьцю узяцца за перабудову партыйнай і прафсаюзнай работы у адпаведнасьці з указаньнямі тав. Сталіна.

Неабходна ў кожнай брыгадзе стварыць трыкутнікі, якія-б вялі рашучую барацьбу з бракам і па-баявому змагаліся за выкананьне вытворчых заданьняў.

Брыгадны трыкутнік павінен змагацца за ліквідацыю ўраўнілаўкі, абязьлічкі, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў брыгадах.

Ня трэба забываць, што старэйшы брыгадзір зьяўляецца дырэктарам сваёй брыгады. Ён павінен кіраваць брыгадай весьці вучот работы кожнага рабочага.

І калі сёньня фабрыка спраўляецца з выкананьнем вытворчай праграмы, дык на якасьці і зьніжэньні сабекошту яна адстае.

Толькі на падставе рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна можна дабіцца зьніжэньня сабекошту і падняцьця прадукцыйнасьці працы. ЦП саюзу гарбароў павінна дапамагчы выправіць усе недахопы на фабрыцы.

А. Манькоў.

НАПЯРЭДАДНІ XIV ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. На здымку: Устаноўка фэрм на будаўніцтве цэху ўрубавых машын Горлаўскага машына-будаўнічага заводу (Данбас). Цэх будзе пушчан у дні XIV гадавіны Кастрычніка.

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

ВАРАШЫЛАУЦЫ РАЗГОРТВАЮЦЬ барацьбу за фінансавы плян

ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА БЯРЭ НА БУКСІР ЗАВОДЫ „КАМУНАР" І „ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК".

Адозва Чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава

Рабочая якая БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі дасягнула вялізарнейшых посьпехаў у будаўніцтве сацыялізму.

Гэты год, як і мінулыя гады, ня толькі паказаў рэальнасьць пяцігодкі, але і забясьпечыў па радзе галін выкананьне пяцігодкі значна раней тэрмінаў прадугледжаных плянам.

Выдучы штодзенную ўпартую барацьбу за якасныя і колькасныя паказальнікі выкананьня вытворчых праграм, мы абавязаны з найменшай энэргіяй змагацца за поўнае выкананьне і перавыкананьне фінплану, як базы пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

На гэтым адказным вучастку мы маем рад недахопаў, асабліва ў галіне добраякасных плацяжоў, рэалізацыі пазыкі трэцяга рашаючага году пяцігодкі, укладаў у ашчадкасы, палнакапленьняў і інш.

Зараз па БССР праводзіцца фінэстафэта, якая павінна ліквідаваць усе прарывы ў фінплане і забясьпечыць зрух у гэтай справе, паставіўшы ў далейшым гэты вучастак пад пастаянны рабочы кантроль.

У выніку правядзеньня фінэстафэты на павінна быць ніводнага працоўнага, які-б не падпісаўся на пазыку, ніводнага працоўнага—без ашчадкніжкі. Запазычанасьць па паёх у каапэрацыі павінна быць безадкладна ліквідавана.

На сёньняшні дзень па нашым заводзе мы дабіліся наступных дасягненьняў у выкананьні фінансавага пляну:

1. 100 проц. ахоп рабочых укладчыкамі ашчадкасы і поўнае выкананьне кантрольнай лічбы па ўкладах.

2. 100 проц. выкананьне кантрольнай лічбы па пазыцы «Трэці рашаючы».

3. 100 проц. ахоп калектыўным страхаваньнем рабочых кацельнага, такарнага, мадэльнага і кавальскага цэхаў.

4. 100 прац. афармленьне падпіскі па пазыцы і своячасовае ўнясеньне чарговых узносаў.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя дасягненьні, мы лічым, што ў часе правядзеньня фінэстафэты мы павінны яшчэ больш разгарнуць работу па накапленьні вольных сродкаў для фінансаваньня нашага будаўніцтва.

Мы, рабочыя чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава, усе як адзін уключаемся ў фінэстафэту, якая зараз праводзіцца, і бярэм на сябе абавязак:

1. Замацаваць 100 проц. ахоп як старых, так і новых рабочых заводу падпіскай на пазыку «Трэці рашаючы», не дапускаць зьніжэньня падпіскі і забясьпечыць поўны ахоп падпіскай новаприбываючых рабочых, не пакідаючы ніводнага рубля падпіскі не аформленым.

2. Усім рабочым стаць актыўнымі ўкладчыкамі ашчадкасы і захоўваць у ёй свае часова вольныя сродкі.

3. Усе свае плацяжы за камунальныя паслугі праводзіць безнаяўнымі разрахункамі праз ашчадкасу.

4. Ахапіць усіх рабочых заводу калектыўным страхаваньнем жыцьця.

5. Дапамагчы ў ліквідацыі прарываў і арганізацыі працы па мабілізацыі сродкаў у падшэфным сельсавеце, для чаго ў сельсавет высылаем рабочую брыгаду.

Мы выклікаем усіх рабочых і служачых БССР паследаваць нашаму прыкладу і сваім удзелам у выкананьні фінансавага пляну забясьпечыць пасьпяховае выкананьне народна-гаспадарчага пляну.

Для практычнай дапамогі заводам Менску ў гэтай рабоце мы бярэм на грамадзкі буксір заводы «Дрэваапрацоўшчык» і «Камунар», на якія высылаем рабочыя брыгады.

Па даручэньні агульнага сходу рабочых і служачых заводу імя Варашылава, сакратар парткалектыву РОЗЭНБЭРГ.
Старшыня зяўкому ЭСТЭРКІН.
Старшыня камісіі садзейчасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе ЗМАЧЫНСКІ.

Е. СТАСАВА

ПАД СЬЦЯГАМ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ— НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ

Тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове на нарадзе гаспадарнікаў паставіў рад новых задач, якія выцякаюць з сучаснай абстаноўкі сацыялістычнага будаўніцтва. Над выкананьнем паказаньняў тав. Сталіна з бальшавіцкай упартасьцю працуюць усе партыйныя, камсамольскія, прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі краіны. Лёзунг «Па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць» — павінен стаць цэнтральным і ў рабоце добраахвотных грамадзкіх арганізацый — і ў першую чаргу — цыматмільённай арганізацыі МОПР.

Задачы, якія стаяць перад арганізацыямі МОПР'у зараз значна ўскладнілісь. Пастановы XI пленуму ВККІ, чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), прамова тав. Сталіна — абазначылі палітычны сэнс і напрамак работы МОПР'у за сучасны адрэзак часу ад III-га ўсесаюзнага зьезду МОПР'у (люты 1931 г.). Гэтыя пастановы патрабавалі яшчэ больш увагі, чым да гэтага часу павышэньня ролі МОПР'у ў барацьбе за генэральную лінію партыі. Вялізарнасьць кожнай арганізацыі МОПР'у не ўдзельная вага яе сацыялістычнай будоўлі — зараз азначаюць раней за ўсё тым, наколькі яна ўмее мабілізаваць свае сілы на выкананьне канкрэтных задач народна-гаспадарчага пляну раннячага году пяцігодкі, наколькі яна ўмее ў сваёй штодзённай рабоце даваць руйнавальны адпор усякай правае апартуністычнай практыцы. У барацьбе за ленінскую генэральную лінію партыі, у барацьбе на два фронты — супроць правага апартуністычнага, як галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў, супроць усякага прымірэнцтва — расьце і загартоўваецца сусьветны мопраўскі актыў, высоўваючы ўсё новыя і новыя кадры будаўніцтва сацыялізму.

Якія-ж канкрэтныя дасягненьні МОПР'у на фронце сацыялістычнай будоўлі, дзе, найбольш слабыя зьвены яго работы?

Выкананьне лёзунга — поправец у правы ўдарнікаў у барацьбе за прамфінплян — арганізацыямі МОПР'у па СССР, заводзе імя ніводных даных, створаны 514 ударных брыгад, 61 ударны мопраўскі цэх, 9 камун, 4 ударных заводы прынялі імя МОПР'у. На радзе прадпрыемстваў і заводаў мопраўцы паказалі бліскучыя прыклады працоўнага энтузіязму. На харкаўскім Трактарабудзе маладая арганізацыя МОПР'у здолела стварыць 41 ударную брыгаду, якія перавыканалі ўстаноўленыя нормы. Брыгады т. т. Папяніна і Рагазянскага паставілі сусьветны рэкорд па бэтона-замесах, выканаўшы нормы на 620 і 730 проц. Пяць брыгад на Трактарабудзе атрымалі премію, брыгадзір т. Мітрошын прадстаўлен да ордэна Леніна.

У Ленінградзе на заводзе — ВТНУ імя Сталіна, намаганьнямі мопраўцаў была выкупчана ў тэрмін турбіна ў 24 тыс. клв. для Кізілбуда. На Сталінградзкім трактарным, брыгада імя Сако і Ванцэці выканала плян на 110 проц., брыгада імя Парыскай камуны на тымжа заводзе — на 250 проц. Гэта асобныя факты паказваюць, што там, дзе арганізацыі ўмеюць па-бальшавіцку злучаць канкрэтную барацьбу за прамфінплян з задачай інтэрнацыянальнага выхаваньня мас, — там посьпех забясьпечан. Дзе няма гэтай бальшавіцкай мабілізацыі мас, дзе камітэты плятуцца ў хвасьце — там у наяўнасьці прарывы, там ганебнае адставаньне. Так напрыклад, прыпалося вымяніць увесь склад гарадзкога камітэту МОПР'у ў Сталінградзе, каб пасунуць работу наперад.

Другая бальшавіцкая сяўба, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі, выкананьне дырэктыў чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб уборачнай кампаніі — патрабавалі ад арганізацыі МОПР'у павароту тварам да калгасу, саўгасу. МТС — 400 з пішным брыгад мопраўцаў былі пасланы з прамцэнтраў на вёсну, створана звыш тысячы новых калгасных ячэек, засеяна 4.463 «мопраўскіх палосак» у карысьць палітзьняволеных. Перадавікі бальшавіцкай сяўбы — калгасы імя МОПР'у на Паўночным Каўказе і ў Дагестане выклікалі калі на спаборніцтва суседнія калгасы. У Растове, Вязьме, Бранску і інш. месцах мопраўцы прынялі актыўны ўдзел у праверцы гатоўнасьцю транспарту прыняць хлебны паток новага ўраджаю. І як асабліва важны па сваім палітычным значэньні факт — трэба адзначыць пастанову ЦК МОПР'у аб распаўсюджваньні пасылкі ў адноасобным сэктары вёскі на суму ў 50 млн. руб.

Пералічэньне ўсіх гэтых фактаў паказвае, што МОПР у СССР змог дабіцца раду станоўчых результатаў у барацьбе за пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму, за выкананьне задач, пастаўленых нашай партыяй. На гэтай аснове мы колькасна ўзрасьлі, дабіліся большага ахопу працоўных членствам МОПР'у. Лёзунг, даны ЦК МОПР'у СССР — дазесьці колькасьць членаў МОПР'у да 10 мільёнаў членаў — пасьпяхова правопіцца ў жыцьцё: маркуючы пэ фактычнай уплаце членскіх узносаў мы аб'яднаем зараз звыш 7,5 мільёнаў членаў. Значна ўмацавалася і матар'яльная база МОПР'у: за увесь 1930 г. у ЦК МОПР'у паступіла 2.697.000 руб., а толькі за студзень-чэрвень 1931 г. — 3.049.500 р.

Масавай выхаваўчай рабоце, умацаваньню інтэрнацыянальнай сувязі з брацкімі арганізацыямі за мяжой, прывядзеньню розных кампаній, салідарнасьці і дапамогі ахвярам белага тэрору — арганізацыі МОПР'у аддавалі нямала ўвагі і сіл.

Адзначым хаця-б шырокую кампанію ў абароне прытаворных клясавым судом амэрыканскай буржуазіі ў нягрыцянскіх маладых рабочых у Скотсборо, будаўніцтва інтэрнацыянальнага дзіцячага дому ў Іванава-Вазьнясенску для 120 дзяцей зарубежных рэвалюцыянэраў, наведваньне Савецкага Саюзу делегацыямі брацкіх арганізацый Чырвонай Дапамогі Нямеччыны, Францыі Аўстрыі і інш.

Але было-б вялікім самаашуканствам ня бачыць побач з бязумоўнымі дасягненьнямі, і вельмі істотных недахопаў у нашай рабоце. Карэнная перабудова нашай работы на аснове паказаньняў тав. Сталіна ня ўсюды ідзе належнымі тэмпамі, у наяўнасьці ў цэлым радзе камітэтаў адставаньне ад узрослай палітычнай актыўнасьці мас. Непрымірымая барацьба з абязьлічкай у рабоце камітэтаў і ячэек МОПР'у, руйнавальны адпор практыцы саманёку і безадказнасьці ў асобных зьвеньнях арганізацыі, поўнае правядзеньне прынцыпу персональнай адказнасьці кожнага работніка за даручаную яму справу, пры захаваньні метаду калектыўнага кіраўніцтва — вось, што павінна прадпісаць зараз, зьнізу да верху, усю нашу работу. Нам трэба ва што-б там ні стала дабіцца стварэньня жыцьцяздольных ячэек ва ўсіх калгасах, саўгасах і МТС, не забываючы пры гэтым і прапаганды ідэй інтэрнацыянальнай салідарнасьці і сярод бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнага сялянства.

Гіганты новабудоўлі павінны стаць апорнымі пунктамі масавай работы МОПР'у, мы павінны дабіцца пагадоўнага ахопу рабочых будаўнічых прамысловых прадпрыемстваў. Нашы камітэты павінны аўладаць мэтадам бальшавіцкай арганізацыйнасьці, правільна ўлічваць мясцовую абстаноўку, своячасова рэагаваць на новыя запатрабаваньні мас. На ўсю вышыню павінна быць узьнята ва ўсіх зьвеньнях бальшавіцкая самакрытыка: нягодныя работнікі, якія апартуністычна зрываюць і недадаўняваюць значныя перабудовы работы МОПР'у на новых пачатках, павінны быць неадкладна заменены новымі кадрамі актывістаў, якія змогуць забясьпечыць неабходныя тэмпы ў рабоце МОПР'у. Трэба дабіцца значна большага, чым да гэтых пор, удзелу нізавога актыву ў кіруючай рабоце камітэтаў, праводзячы ў жыцьцё прынцып сацыялістычнага сумяшчэньня. Выпрабаваныя бальшавіцкія мэтады мабілізацыі мас — сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва павінны прасякнуць за ўсе важнейшыя мерапрыемствы нашай арганізацыі. Трэба будзе зьвярнуць таксама значна больш увагі на стан арганізацыі МОПР'у ў нацыянальных раёнах і вобласьцях, не забываючы аб вялізарным значэньні нашай работы ў барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку супроць вялікадзяржаўнага павяншызму, як галоўнай небясьпекі і супроць мясцовага нацыялізму.

Сусьветны эканамічны крызіс, які ўступіў у новую фазу і які паглыбляецца з кожным днём, пасьпяваньне прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу ў радзе краін, абвастраньне на гэтай аснове клясавай барацьбы за рынкі — ставяць перад усімі арганізацыямі МОПР'у рад новых і складаных задач. Перадавая сакцыя МОПР'у ў Савецкім Саюзе павінна паказаць прыклад бальшавіцкай перабудовы сваёй работы ў новых умовах.

Другі пленум ЦК МОПР'у, падводзячы вынікі прадзелаенаму з часу III-га зьезду этапу, з усёй рэшчасьцю паставіць задачу яшчэ большага павышэньня ролі МОПР'у, як перадавога атраду савецкай пралетарскай грамадзкасьці ў барацьбе за генэральную лінію партыі, за пяцігодку ў чатыры гады. Выпрацаваньне гэтай задачы яшчэ больш узьнімае абтарытэт МОПР'у ў краіне, дзе будуецца сацыялізм, яшчэ больш узмоцніць значэньне МОПР'у, як прыводнага пасу ад партыі да мас.

3 ЗЬВЯЗДА № 269

Год выдання—XV
№ 269 (4175)
Субота 3. кастрычніка 1931
Цана мутэра 5 кап.
выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Тэлефоны
рэдактар—427,—сакрэтар—10-74, намгорсавет гар—13-60, прэзідыум—13-66, сек. нарпрэсы—6-17, аддзел прапаганды—6-19, сакрэт. ЦК—6-9, аддзел рэдакцыі—6-53, аддзел рэдакцыі інфарм.—10-74, кантора—6-68, аддзел—10-74, кантора—7-81.

ПОЛЫМЯ КЛЯСАВЫХ БАЕЎ АХАПЛЯЕ АНГЛІЮ

ПРАЛЕТАРЫ АДВАЖНА АДБІВАЮЦЬ АТАКІ КОННАЙ ПАЛІЦЫІ

Пад кіраўніцтвам кампартыі пачынаюцца масавыя забастовачныя баі ў Нямеччыне

Сьпеў Інтэрнацыяналу і чырвоныя сьцягі запоўнілі буйнейшыя вуліцы Лёндану

ЛЁНДАН, 1. На працягу ўчарашняга дня ў розных частках Лёндану ўсё яшчэ адбываліся рабочыя дэманстрацыі пратэсту супроць зьніжэньня дапамог і ўрэзак зарплаты. Дэманстрацыі праходзілі пад камуністычнымі пёзунгамі і былі накіраваны супроць «нацыянальнага» ўраду і лейбарыстскай «апазыцыі». Каля будынку паліцэйскага суда конная паліцыя, якая разганяла дэманстрацыю, зьбіла і стаптала некалькі дзесяткаў рабочых. Дэманстранты пасьля гэтага арганізавалі вялікі мітынг каля будынку брытанскага музэя, у якім прымала ўдзел 5.000 рабочых. Паліцыя зноў напала на рабочых і многіх зьбіла і параніла гумавымі палкамі.

Сьледам за гэтым дэманстранты сабраліся яшчэ больш шматлюдны мітынг у Гайдпарку. Пасьля мітынгу рабочыя выйшлі з парку з рэвалюцыйнымі песьнямі і накіраваліся да мармуровай аркі з намерам правесьці новую дэманстрацыю. Увесь рух у гэтым раёне быў спынен. Адбылася сур'ёзная сутычка паміж рабочымі і пешай і коннай паліцыяй. На гледзячы на жорсткае зьбіеньне паліцыяй рабочых, дэманстрацыі разагнаць усё-ж не ўдалося і з пяньнем Інтэрнацыяналу і чырвонымі сьцягамі дэманстрацыя прайшла праз Аксфорд Стрыт. У часе сутычкі ля мармуровай аркі былі паранены некалькі дзесяткаў рабочых і паліцэйскіх. У раёне Клеркенвэль Грын адбыўся бурны мітынг рабочых, на якім прынялі рэзалюцыю, якая патрабуе зьвяржэньня нацыянальнага ўраду.

Лёрд мэр ня меў іншага выхаду

ЛЁНДАН, 1. З усіх канцоў Англіі паступаюць паведамленьні аб працягваньні магутных дэманстрацый, якія праводзяцца зьвязанымі з кампартыяй рабочымі арганізацыямі. У Мэтэрсі 7.000 рабочых сабраліся каля гарадзкой ратушы, дзе патрабавалі, каб гарадзкі савет прыняў іх дэлегацыю, пагражаючы ў выпадку адмаўленьня ўзяць будынак муніцыпалітэту штурмам, ня гледзячы на значныя паліцэйскія сілы. Савет гораду парашыў прыняць дэлегацыю, якая прадставіла сьпіс патрабаваньняў, заявіўшы, што рабочыя будуць працягваць масавую агітацыю, пакуль гэтыя патрабаваньні ня будуць задаволены. Савет гораду абяцаў сур'ёзна разгледзець гэтыя патрабаваньні.

У Бірмінгаме 5.000 рабочых таксама сабраліся ў цэнтры гораду — і накіраваліся да гарадзкой ратушы, дзе патрабавалі скліканьня гарадзкога савету, на якім выбраная дэлегацыя ад рабочых прадставіць свае патрабаваньні. Лорд мэр ня меў іншага выхаду і павінен быў згадзіцца. У Кавэнтры дэманстрацыя 5.000 рабочых прышла да савету гораду, які адмовіўся прыняць дэлегацыю ад рабочых. Дэманстрацыя скончылася масавым мітынгам, на якім было пастаноўлена арганізаваць другую, больш буйную дэманстрацыю для таго, каб прымусіць прыняць дэлегацыю рабочых.

У Брыстолі (Англія) рабочыя ў форме галоднага паходу арганізавалі вялізарную дэманстрацыю супроць ураду. На здымку: тав. ПОЛІТ, підэр ангельскай кампартыі робіць даклад на мітынгу брыстольскіх рабочых.



Парляментальныя выбары ў Гамбургу прынесьлі кампартыі вялікую перамогу. Пік сацыясаў, паданых за камуністаў, павялічыўся з 135.279 да 166.618; пік кампартыі — з 27 да 35. На здымку: перадвыбарчая агітацыя кампартыі. На плякаце напісана: «Сацыялісты на словах, фашысты — на справе — такавы правадыры сацыял-дэмакратыі. Выбірайце камуністаў».

Шпаркі рост дарагоўлі ў Англіі

ЛЁНДАН, 1. Рост дарагоўлі ў Англіі далей зьніжае жыцьцёвы ўзровень мас. Масла ва ўсім Лёндане ўзьнялася на 1 пэнс за фунт, яйкі — на 6 пэнсаў за тузіну, вугаль на 1 пэнс за пуд, кансэрвы розных гатункаў у сярэднім на 3 пэнсы за каробку. Адначасова адзначаецца, як агульнае зьявішча, павышэньне кватэрнай платы. У радзе гарадоў Англіі ўжо праведзена павышэньне платы за праезд у аўтабусах.

„Левы" громаадвод у дзеяньні

БЭРЛІН, 2. У апошнім нумары органу «левай» апазыцыі нямецкай сацыял-дэмакратычнай партыі «Дзі Факель» апублікавана адозва выключаных з партыі «левых» Зэйдэвіца і Розэнфэльда. Гэта адозва, цалкам накіраваная супроць кампартыі, поўнасьцю выкрывае сапраўдны твар «левых» підэраў, уся апазыцыйнасьць якіх мае на мэце толькі адцягненьне рэвалюцыйнага руху сацыял-дэмакратычных рабочых ад кампартыі. «Мы ня ідзем у кампартыю, — заяўляюць у адозве Зэйдэвіц і Розэнфэльд. — Мы істотна адрозьніваемся ад камуністаў у тактыцы і ў арганізацыйнай структуры. Ня існуе ўсеагульнага рэцэпту для рэвалюцыі ва ўсіх краінах, таму мы бачым небяспеку і перашкоду для разьвіцьця клясавай барацьбы ў іншых краінах у бязумоўнай залежнасьці камуністычных сэкцый ад маскоўскага цэнтру».

500.000 падпісала пэтыцыю

ЛЁНДАН, 1. У палату вобшчын былым лейбарыстскім дэпутатам Броўнам прадстаўлена масавая пэтыцыя аб скасаваньні закону аб скарачэньні дапамог па беспрацоўі. Спачатку пэтыцыя была дастаўлена ў палату вобшчын вечарам 29 верасьня асобнай дэпутацыяй. Учора ў палату вобшчын дастаўлены новыя зьвязкі лістоў з подпісамі, агульны лік якіх дасягнуў 500.000. Броўн папрасіў дазволу дэманстраваць дакументы перад членамі палаты вобшчын. Старшыня згадзіўся і пэтыцыя была раскладзена на сталах.

Забастоўка супроць зьніжэньня зарплаты

ЛЁНДАН, 1. Як паведамляюць з Кардзіфа рабочыя, наперакор распараджэньню аб зьніжэньні зарплаты, якое павінна ўвайсьці ў моц з сёняшняга дня, наладзілі мітынг, дзе пастанавілі абвясьціць забастоўку. Мэталісты, якія належаць да руху меншасьці, заклікаюць пераварыць пачатую забастоўку ва ўсеагульную забастоўку рабочых і ставяць для гэтай мэты забастовачным камітэты.

У Руры разгортваецца забастоўка гарнякоў

БЭРЛІН, 1. Частковыя забастоўкі гарнякоў, якія пачаліся ўчора ў Рурскай вобласьці, пашыраюцца. У радзе капалень бастуюць 100 проц. рабочых. Амаль усе капальні заняты ўзмоцненымі паліцэйскімі атрадамі. Паліцыя бязьлітасна разганяе мітынгі рабочых і арыштоўвае прамоўцаў. Сацыял-дэмакраты заклікаюць вугляпопаў працягваць работу. Цэнтральны стачачны камітэт, які кіруецца рэвалюцыйнай прафапазыцыяй, заклікае гарнякоў Рурскай вобласьці з узмоцненай энэргіяй весьці барацьбу. «Межрабпом» арганізуе дапамогу бастуючым.

У Вурмскай вобласьці забастоўка салідарнасьці

БЭРЛІН, 2. Забастоўка гарнякоў у Вурмскай вобласьці (Заходняя Нямеччына) ахапіла тры капальні. У гэтых трох капальнях бастуе каля 90 проц. рабочых. На астатніх трох шахтах пакуль што бастуюць толькі асобныя групы рабочых. Чакаецца пашырэньне забастоўкі. Забастоўка праходзіць пад лёзунгам салідарнасьці з барацьбою рурскіх гарнякоў і з бастуючымі гарнякамі Верхняй Сілезіі.

Голас гневу і пратэсту

супроць зьверстваў польскіх турэмшчыкаў— нясецца з усіх куткоў краіны Саветаў

Рабочыя, калгасьнікі і члены прафсаюзаў Бягомльшчыны ў адказ на зьверствы польскіх фашыстаў над палітзьняволенымі арганізавалі суботнік па дарожным будаўніцтве. Пасьля суботніку быў арганізован мітынг пратэсту. У прынятай рэзалюцыі рабочыя і калгасьнікі гавораць:

— Ведайце, фашысцкія каты, што працоўныя Савецкага Саюзу ў любы момант стануць у абарону сваіх зьняволеных братоў, у абарону дзесяці тысяч палонынікаў фашызму стане ўвесь сьвет працы.

Мы дамагаемся зараз-жа зьвярнуць палітзьняволеным іх правы і скасаваць дэкрэт аб увядзеньні ваенна-палявых судоў.

Мы адказваем польскім фашыстам новым уздымам творчага энтузіязму і абазначаем аддаць усе свае сілы на выкананьне палітычна-гаспадарчых задач раёну.

* * *

Калгасьнікі і калгасьніцы прымежнага Бягомльскага раёну, сабраўшыся на раённую канфэрэнцыю, вынесьлі наступны пратэст супроць крывавых учынкаў польскага фашызму:

«Праз турэмныя краты да нас даходзяць жудасныя весткі аб нячуваных зьдзеках над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі, якіх польскі фашызм кінуў у турмы. Мы рашуча пратестуем супроць увядзеньня новага фашысцкага рэгляменту ў турмах, які разьвязвае рукі турэмным катам-садыстам. Мы патрабуем скасаваць гэты закон разам з дэкрэтам аб увядзеньні ваенна-палявых судоў.

Наш раён ужо калектывізаваны на 77 проц. У адказ польскім фашыстам мы абяцаем выканаць і перавыканаць пляны асеньняй сяўбы і зяблева, а таксама пляны сіласаваньня.

Для пастаяннай дапамогі зьняволеным братом мы ўсе ўступаем у рады МОПР'у.

* * *

Ячэйка ЛКСМБ калгасу «АДРАДЖЭННЕ» (прыгарадны сельсавет, Менскага раёну), АДПРАЦАВАЛА ДВА ДНІ Ў ФОНД ДАПАМОГІ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМ. ЗАРОБЛЕНЫЯ 40 РУБ. ПАСЛАНЫ Ў ЦК МОПР'у.

Ячэйка ВЛКСМ калгасу «ЧЫРВОНЫ ГАРОДНІК» і ІМЯ КРУПСКАЙ.

---◆ Дэфіцыты дзяржаўнага казначэйства (правышэньне расходаў над даходамі) ва Францыі дасягаюць 7 мільярдаў франкаў. Рад буйных французкіх банкаў на парозе банкрутства.

„ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач. 7, 9-45; 10-30 — Першы гукавы мастацкі фільм Пуцёўка ў жыцьцё, драма ў 34 эпізодах.
„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — Новы мастацкі фільм РАЗГРОМ
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкі фільм: ГАРАДЫ І ГАДЫ, Пачатак сэансу у 2 гадз. дня.
Інтэрнацыянал Адкрыт з 12 г. дня — Бунт бабулек, Зьвыш. прагр. хроніка № 31
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм ДЫЗЫМІ ХІГІНС у 8 частках, Зьвыш праграмы—хроніка. Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 г. Каса адкрыта з 5 г. — З 1-га кастрычніка—базавік РЭЙНСКІ БУНТАР, драма ў 7 частках.

З 15 кастрычніка г. г. пры беларускім каапэрацыйным ін-це адкрываюцца 10-МЕСЯЧНЫЯ ВЯЧЭРНІЯ КУРСЫ па падрыхтоўцы ў інстытут без адрыву ад вытворчасьці
На курсы прымаюцца рабочыя і ін утрыманцы якія маюць адукацыю не ніжэй 6-7 груп 7-годкі (асобы, якія ня маюць дакумантаў аб адукацыі 7 груп, павінны трымаць іспыты). Узрост ад 17 да 35 год.
Курсанты стыпэндыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца. Прыём заяў з адзначанымі дакумантамі: аб адукацыі, аб сацыяльным паходжаньні і становішчы, аб выбарчых правах, аб ўзросьце, аб адносінах да вайсковай павінасьці, аб здароўі заверанай анкета. і дзьве фота-карткі—праводзіцца ў канцылярыі інстытуту (галоўны корпус БДУ, пакоі 123 і 125) да 15 кастрычніка г. г. Інстытут каапэрацыі рыхтуе таваразнаўцаў-тэхналёгаў і арганізатараў гандлю на дрэваапрацоўчай, скураная абутковай, плода - гародная і малочна-масьлянай галінах і эканамістаў плянавікоў.
Дырэкцыя ін-ту.

УВАГА! Скора выходзіць з друку першы нумар ілюстраванай навукова-тэхнічнай часопісі ВСНГ і ЦПСБ „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ"
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" разьлічана на шырокія колы кананднага складу прамысловасьці, партыйна-камсамольскага і прафэсіянага актыву, кваліфікаваных рабочых-вынаходцаў, ударнікаў.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" ставіць перад сабой задачу ўнядрэньня тэхнікі і сацыялістычнай арганізацыі працы на строга навуковай падставе ў прамысловасьці БССР.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" мае аддзелы: 1) Ягуль ны; 2) Арганізацыя вытворчасьці; 3) Дасягненьні навукі і тэхніці ў СССР і за мяжой; 4) Абмен опытам; 5) Кадры і рабсілы; 6) На мясцох; 7) Хроніка; 8) Сярод кніжак; 9) Адказы і кансультацыі.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на год—3 р., на 6 м-цаў—1 р. 60 к., на 3 м.—85 к. Кошт паасобнага нумару—30 кап.
АДРАС РЭДАКЦІІ: Менск, Пляц Волі № 21-1, ВСНГБ, 2-гі паверх, пакой № 6. Тэлефон № 14-33.
За выхадам нумару сачыце ў газэтах,
Падпіска прымаецца толькі праз пошту і паштовых агентываў.

ЗЛОЧЫНЫЯ ДЭЗАРГАНІЗАТАРЫ РОСЬЛІСУ
РАЗРЫСОЎКІ па ўсемач. тканінах. Фарбамі: рэзэрв., алейн., малеб. пярскамі. Трафаретамі: блісн., бісер., жэмчуг і інш.
Спосаб: нерасплыўны, ярчэйшы, проста. росьліску, мякшы за ўсе. Ураўнаважаны ў фарбах. Росьліс глядзіцца ўсюды, цэлюлёза, скуры, дрэва. Да лесьнай прымацавацца зьвыш 200 малюн. зразкі тэкстаўмі. Па скончэньні выд. пасьведчаньне. Уменьне малад. не патрабуецца. Падрабязнасьці высылае за 20 к. дробн. пашт. маркамі.
Масква, вул. Дзяржынскага, д. № 1. ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ СОЮЗ.

4 кастрычніка, у 7 гадз. веч., у агульнай залі БАН адбудзецца даклад тав. АЛЯКСАНДРАВА на тэму „Мястэчкі БССР ў рэканструкцыйны пэрыяд"
Яўка ўсіх супрацоўнікаў ін-ту эканомікі і асьпірантаў эканамістаў абавязкова. На даклад запрашаюцца працаўнікі Дзяржплану, ВСНГ і члены т-ва эканамістаў-марксыстаў. Уваход вольны.
Дырэктарыят ін-ту эканомікі БАН.

Агітпрапагандысцкі аддзел Менгаркому КП(б)Б 4 кастрычніка, у 7 гадз. веч., у залі пасяджэньняў гаркому (3-ці паверх) скліканы — нарады жанарганізатараў партканцэлярыі і ячэек КП(б)Б культработнікаў, ФЗМК і культработнікаў МАКТ'аў (чэснаў партыі)
Парадак дня: 1) аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі жандэлегатаў. Своечасовая яўка абавязкова.

4 кастрычніка, а 7 гадз. веч., у памяшканьні залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)Б (3-ці паверх) скліканы — агульна-гарадзкі сход членаў і кандыдатаў КП(б)Б і ЛКСМБ—латышоў
Яўка абавязкова.

Дом Канасьветы
Сёньня, 3 кастрычніка, у 8 гадз. веч. адбудзецца даклад тав. М. А. СЕМАШКА на тэму „Крызіс капіталізму і пасьляхавае сацыялістычнае будаўніцтва СССР"
Білеты ў Культпропе Гаркому КП(б)Б.

Кошт публікацыі аб згубе дакумэнту 1 руб.

Войскі акупантаў застаюцца ў Манчжурыі

КІТАЙ АХОПЛЕН АНТЫІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫМ РУХАМ

Блёф эвакуацыі і сапраўднасьць анэксіі

ШАНХАЙ, 1. Наперакор заявам японцаў аб тым, што яны выводзяць свае войска з акупаваных раёнаў і ня гледзячы на рэзалюцыю савету Лігі Нацый, у якой канстатуецца, што японцы, быццам-бы прыступілі да вываду сваіх войск, з паўночнай Манчжурыі паведамляюць, што японцы адпраўляюць новыя войскі ў Гірынскі раён, дзе „выбухнулі антыкарэйскія беспарадкі, выкліканыя беглымі кітайскімі салдатамі". У той-жа час паведамляецца з Токіё, што цяпер пасьля сканчэньня сэсіі Лігі Нацый японскія ваенныя ўлады рашуча адкідаюць думку аб эвакуацыі да здавальняючага вырашэньня ўсіх спрэчных пытаньняў паміж Кітаем і Японіяй.

Арыштаваны асобы якія зьбілі міністра

ШАНХАЙ, 1. У сувязі са зьбіеньнем нанкінскага міністра замежных спраў студэнцкай дэманстрацыяй у Нанкіне арыштаваны 4 прафэсары, якія абвінавачваюцца ў нападзе на Ван Чжэн-ціна. Сярод студэнцтва ў Нанкіне і Шанхаі пачаўся рух за вызваленьне арыштаваных.

Забастоўка партовых рабочых

БЭРЛІН, 2. Забастоўка партовых рабочых у Данцыгу, якой кіруе рэвалюцыйная прафапазыцыя, перакінулася ў порт Эльбінг (Усходняя Прусія), які знаходзіцца каля Данцыгу, дзе забаставалі ўсе партовыя рабочыя. Тут забастоўка таксама ўзначальваецца рэвалюцыйнай прафапазыцыяй.

Новы напад японскіх войск

ТОКІЁ, 2. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго з Мукдэна, японскія войскі разбоілі кітайскі гарнізон і паліцыю ў Кайюане і занялі будынак самаўраду, арыштаваўшы павятовага начальніка паліцыі. Паводле слоў агенцтва Дэмпо, баі працягваюцца. Агенцтва сьцьвярджае, што «апэрацыя» зроблена, з боязьні, што кітайскія часьці «могуць прыняць рашэньне атакаваць Кайюан».

Японскім таварам у Кітаі больш збыту няма.

ТОКІЁ, 1. Шанхайскі карэспандэнт японскай газэты «Асахі» сьцьвярджае, што ў галіне фінансаў, гандлю бавоўняна- паперосаў, гандлю таварамі, а таксама ў галіне морскага транспарту паміж абедзьвюма краінамі фактычна адбыўся поўны разрыў. Зараз на японскіх складах у Шанхаі знаходзіцца на 650.000 іен тавараў бяз усякай пэрспэктывы іх рэалізацыі. Імпарт японскага цукру ў Кітай зусім спынен. Японскі цукар заменен яванскім. Частка цукру ўвозіцца з Ганконга.

Замест „папяровай цыганіны" — адказ гарматнымі ядрамі

ТОКІЁ, 2. З часу ўзьнікненьня ваенных дзеяньняў у Манчжурыі, нанкінскі ўрад адправіў японскаму тры ноты пратэсту. Прадстаўнік японскага міністэрства замежных спраў заявіў, што японскі ўрад І НЯ ДУМАЕ Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС АДКАЗВАЦЬ НА ГЭТЫЯ НОТЫ.

---◆ 12 мільёнаў беспрацоўных налічваецца ў ПАЗШ.

„Палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задача" (І. (Сталін),

Цёплаэлектрацэнтраль— ПАБУДАВАЦЬ У ТЭРМІН!

Будаўніцтва Менскай цёпла-электрацэнтралі разгортваецца вельмі павольнымі тэмпамі. Зімой павінен быць выведаен фундамант галоўнага корпуса, да восені 1932 г. павінна быць скончана поўнасьцю будаўніцтва галоўнага корпуса, пасьля чаго трэба пачаць мантаж абсталяваньня. Яшчэ ў гэтым годзе павінны быць пабудаваны дапаможныя будынкі, склады, майстэрні і г. д. Але ход будаўніцтва не гарантуе выкананьня ў тэрмін вызначаных плянаў.

Будаўнічыя матар'ялы загатаўляюцца не ў выстарчальнай колькасьці. Наогул невядома, калі і колькі матар'ялаў пабудова атрымае. Абсталяваньне для ЦЭЦ яшчэ не заказана. Пабудова не ўкамплектавана інжынэрна-тэхнічнымі работнікамі. Белбуд'яднаньне не дае інжынэраў-будаўнікоў. Асноўная перашкода ў тым, што Энэргацэнтр ня ўключыў пабудову ў сваю сыстэму, што пагражае своячасоваму забесьпячэньню будаўніцтва матар'ялямі і абсталяваньнем.

Зараз на тэрыторыі электрацэнтралі будуюцца два баракі для рабочых, дасьледуецца грунт, да месца пабудовы праводзіцца чыгуначны шлях. Прыступлена да распрацоўкі рабочых чарцяжоў галоўнага корпусу, удасканальваецца генэральны плян будаўніцтва.

Пабудова ЦЭЦ павінна быць неадкладна ўключана ў сыстэму Энэргацэнтру.

С.

Менбуд затрымлівае пуск аўтаматычнай тэлефоннай станцыі

Будынак аўтаматычнай тэлефоннай станцыі ўжо гатоў, але да мантажу абсталяваньня прыступіць нельга. 8-га жніўня адбылася першая прыёмка будынку. Камісія на прыёмцы знайшла шмат недахопаў: вэнтыляцыя не ўстаноўлена, у тэхнічных пакоях падлога не гарызантальная, не праведзена электрычнасьць, сьцены акумулятарнай станцыі пакрыты масьлянай фарбай, замест патрэбнай кіслотна-ўпорнай.

Цэнтральнае кіраўніцтва пабудовамі абяцала зьвішчыць усе недахопы праз 8 дзён. Дагэтуль абяцаньне ня выкананa. Увесь мантаж абсталяваньня павінен пранягнацца 8 месяцаў. Пры бесьперабойным забесьпячэньні пабудовы дэталямі, інжынэрна-тэхнічныя работнікі абавязваюцца скончыць мантаж за 6 месяцаў, але абсталяваньне прыбыла толькі на палову. Ленінградзкі завод тэлефоннага абсталяваньня «Красная заря», завод «Мосэлектрык» і Харкаўскі электрозавод ня выконваюць заказу на абсталяваньне для Менскай аўтаматычнай тэлефоннай станцыі.

Менбуд, які будуе дом станцыі, павінен у самы кароткі тэрмін выправіць выяўленыя камісіяй недахопы. Належным органам трэба прыняць меры, каб усё абсталяваньне прыбыла своячасова

І-н.

ПЛЯН СІЛАСАВАНЬНЯ НА 1932 ГОД

Праўленьне Калгасцэнтру зацьвердзіла плян сіласаваньня па калгасах на 1932 год у 1 міл. тон.

З гэтага ліку 455 тыс. тон мяркуецца засіласаваць па Мясамалакацэнтры (МТКФ і фэрмы па гадоўлі цялят) з разьліку 2,5 тоны сіласу на карову, 1,5 тон на нецель, 1 тона на быка і 0,5 на цялё

Па Сьвінаводцэнтры (СТКФ) намечана засіласаваць 275 тыс. тон з разьліку 0,13 тон на сьвіню і 0,3 на падсьвінка.

Іншыя 270 тыс. тон будуць засілаваны ў неспэцыялізаваных калгасах.

Праўленьне Калгасцэнтру ўхваліла сіласаваньне праводзіць галоўным чынам у ямах, траншэях, а таксама ў наземных канцох.

200 гэктараў пад тутавае дрэва

Улічыўшы станоўчы вопыт разьвядзеньня тутавага дрэва ў паўднёвых раёнах БССР, калегія НКЗБ уносіць у Эканомсавет БССР пытаньне аб пашыраньні пасеваў тутавага дрэва ў 1932 годзе.

Мяркуецца арабіць пасадку тутавага дрэва ў паўднёвых раёнах на плошчы 200 гэктараў.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

Прафсаюзы—тварам да загатовак!

Прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў пытаньне аб ходзе загатовак і ўдзеле ў іх прафсаюзаў БССР. Прэзыдыум адзначыў, што РАЗГОРТВАНЬНЕ ЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ ПРАХОДЗІЦЬ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

«Аднэй з прычын такога становішча загатовак, — гаворыцца ў пастанове прэзыдыуму, — зьяўляецца АДСУТНАСЬЦЬ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ І СЛАБЫ ЎДЗЕЛ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ШЫРОКІХ МАС ПРАЦОЎНЫХ у гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. ЦП саюзаў і асабліва райпрафсаветы яшчэ да сучаснага моманту поўнасьцю ня ўключыліся ў барацьбу за своячасовае выкананьне загатоўчых плянаў».

Прэзыдыум прапанаваў усім райпрафсаветам і цэнтральным праўленьням саюзаў НА ПРАЦЯГУ 5 ДЗЁН мабілізаваць прафсаюзныя масы вакол загатовак, прыцягнуць іх да практычнага ўдзелу ў кампаніі, шляхам пасылкі брыгад у адстаючыя раёны, вылучэньня лепшых актывістаў — членаў прафсаюзаў для правядзеньня палітмасавай работы на загатоўчых пунктах.

ЦП САЮЗАЎ, МТС І БАТРАКОЎ РАБОЧЫХ ЗЯМЛЯРОБЧЫХ САЎГАСАЎ, ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ ПРАЦАСЬВЕТЫ, РАБОТНІКАЎ КААПЭРАЦЫІ І ДЗЯРЖГАНДЛЮ, РАБОТНІКАЎ ДЗЯРЖУСТАНОЎ, МЭДСАНПРАЦЫ, РАБОЧЫХ МУКАМОЛЬНА-ХЛЕБНАЙ І КАНДЫТЭРСКАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ і інш. саюзаў, якія абслугоўваюць вёску, прапанавана ў 5-цідзённы тэрмін пераключыцца на ўдзел у правядзеньні загатовак, як аднэй з асноўных задач сучаснага пэрыяду. Барацьба за выкананьне плянаў загатовак для гэтых прафсаюзаў павінна зьвяцца барацьбой за выкананьне прамфінплану.

У мэтах узмацненьня барацьбы з засьмечанасьцю загатоўчага апарату чужым элемэнтам, прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў да 15 кастрычніка МАБІЛІЗАВАЦЬ 200 ЛЕПШЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ І САЎГАСЬНІКАЎ НА ПАСТАЯННУЮ РАБОТУ Ў НІЗАВЫХ ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ. Гэта колькасьць разьмеркавана паміж асобнымі прафсаюзамі наступным чынам: ЦП саюзу МТС і батракоў павінна мабілізаваць 100 чалавек, ЦП саюзу рабочых зямляробчых саўгасаў — 50 чал. І ЦП саюзу рабочых жывёлагадоўчых саўгасаў — 50 чал.

Адзначыўшы слабое разгортваньне сацыялістычных мэтадаў працы сярод работнікаў загатоўчых органаў, прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў «ЦП саюзаў рабочых мукамольна-хлебнай вытворчасьці, работнікаў каапэрацыі і Дзяржгандлю на працягу дзённага тэрміну зрабіць рашучы пералом у сэнсе большай гібкасьці і дакладнасьці, работнікаў каапэрацыі і Дзяржхам разгортваньня агітмасавай работы ахапіць поўнасьцю сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам усіх членаў саюзаў, якія працуюць у загатоўчым апараце».

Усім гарадзкім і раённым саветам прафсаюзаў даручана да 15 кастрычніка склікаць НАРАДЫ СТАРШЫНЬ МК, якія абслугоўваюць загатоўчыя арганізацыі і прафактыў раёнаў, для абгаварэньня пытаньня аб разгортваньні масавай работы вакол загатовак.

Прэзыдыум прыняў да ведама, што на месцы ўжо выехала 10 адказных работнікаў ЦСПСБ і ЦП саюзаў для правядзеньня загатовак і дурачыў арганізацыйна - інструктарскаму сэктару ЦСПСБ накіраваць ДАДАТКОВА групу адказных прафработнікаў У АДСТАЮЧЫЯ РАЁНЫ для арганізацыі і мабілізацыі прафсаюзных мас на ўдарнае выкананьне плянаў загатовак.

Адзначыўшы, што «за выключэньнем газэты «ЗЬВЯЗДА», цэнтральныя і мясцовыя газэты, насьценгазэты і шматтыражкі ня ўключыліся па-баявому ў загатоўчыя кампаніі», прэзыдыум ЦСПСБ зьвярнуўся да ўсяго друку з заклікам паставіць загатоўчую кампанію ў цэнтр увагі штодзённай сваёй работы, мабілізаваць вакол загатовак шырокую пралетарскую грамадзкасьць.

Калгасцэнтр і НКФ

павінны даць ясны адказ

Для таго, каб правільна і своячасова разьмеркаваць прыбыткі сярод калгасьнікаў, неабходна паказаць самыя простыя формы тэхнікі, якім чынам разьмеркаваньне трэба рабіць. Мы ўжо падавалі папярэдняе разьмеркаваньне прыбыткаў калгасу «Камбайн», што значна дапамагло рахунковаму апарату ў яго рабоце.

Але на практыцы пры разьмеркаваньні сустракаецца з цэлым радам пытаньняў, на якія ня кожны зможа даць адразу ясны адказ. Падамо характэрны прыклад, нешта накшталт казкі пра белага бычка. У палажэньні аб адзіным с.-г. падатку на 1931 год гаворыцца:

«Падатак вылічваецца з кожнага асобнага калгсу на яго валавым прыбытку... З валавога прыбытку калгасу пры вылічэньні падатку выключаюцца: а) усе адлічэньні ў непадзельны і другія грамадзкія фонды; б) усе скідкі па ільготах...» і г. д.

А што гаворыцца ў пастанове НКЗ і Калгасцэнтру БССР ад 3-га верасьня «аб разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю калгасаў у 1931 годзе»?

«Парадак адлічэньняў у непадзельны і іншыя грамадзкія фонды ўстанаўляецца наступны: з агульнага даходу калгасаў робяцца адлічэньні насеннага і страхавога фондаў, фуражнага і запаснога фондаў, сум якія павінны пайсьці на выплату сельгаспадатку, страхоўкі і плацяжоў па крэдытах 1931 году. Пасьля паказаных адлічэньняў з сумы даходаў калгасаў, якія засталіся, ствараецца непадзельны фонд...»

Такім чынам, для таго, каб правільна вылічыць падатак, трэба раней з валавога прыбытку вылічыць усе адлічэньні ў непадзельны і іншыя грамадзкія фонды, а каб правільна стварыць непадзельны і другія фонды, трэба раней з агульнага даходу вылічыць сельгаспадатак.

Сапраўды агрымліваецца казка пра белага бычка. Адлічэньні ў фонды мы зробіш, ня вылічыўшы сельгаспадатку, а ўстанаўленьня сум сельгаспадатку мы зробіш, ня вылічыўшы фонды. Самы лепшы матэматык і той ня зможа разьвязаць гэту задачу.

Мы зьвярнуліся за растлумачэньнем у Наркамфін БССР. Там атрымалі вельмі просты адказ. Работнік Наркамфіну Рубін заявіў: «Палажэньне аб сельгаспадатку выйшла раней, чым пастанова Калгасцэнтру, а таму нікаі яны не хлёбываюць гэту справу».

Работнікі-ж Калгасцэнтру гаворылі: «Так, атрымалася некаторая няўзгодненасьць і таксама не сьпяшаюцца з растлумачэньнем.

Мы павінны дабіцца, каб кожны работнік на месцы ня блытаўся з вылічэньнем непадзельных фондаў, каб было іх штучнага зьніжэньня. З гэтай мэтаю мы патрабуем ад Белкалгасцэнтру і Наркамфіну БССР у бліжэйшыя-ж дні даць ясны адказ на пастаўленае намі пытаньне.

8.

Адказны рэдактар — С. БУДЗІНО

Менск, друкарня «Зьвязда».

Гапоўніт Бел № 237.